ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і МАСТАЦТВА

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

№ 76 (1713) | Пятніца, 21 верасня 1962 года | Цана 4 кап.

На прадпрыемствах, у калгасах і саўгасах рэспублікі разгортваецца сацыялістычнае спаборніцтва ў гонар 45-й гадавіны Вялікага Кастрычніка. Муляры будаўнічых трэстаў сталіцы бяруць абавязацельствы датэрмінова закончыць узвядзенне жылых аб'ектаў. Мантажнікі Полацкага нафтаперапрацоўчага завода пачалі спаборніцтва за штодзённае перавыкананне зменных заданняў. Чыгуначнікі водзяць цяжкавагавыя поязды. І так усюды, на якое б прадпрыемства ні прыйшлі, якую будоўлю ні наведалі б. Кожны дзень працоўных Беларусі дамагаюцца новых поспехаў у імя слаўнай гадавіны.

Пачалі ганаровыя вахты і рабочыя паліграфічнага камбіната імя Я. Коласа. Тут змагаюцца за прадукцыю высокай якасці — каб кожная выдадзеная кніга была добра надрукавана, каб малюнкі былі чоткія, каб вокладка вабіла чысцінёй і акуратнасцю.

Дастойную сустрэчу святу рыхтуюць друкары афсетнага цэха. Кандыдат у члены КПСС Мікалай Хурцін, якога вы бачыце на нашым здымку справа, узначальвае брыгаду камуністычнай працы. Ён самааддана працуе і штодзённа перавыконвае зменныя заданні на 110—115 працэнтаў. Памочнікам у брыгадзіра працуе малады друкар Георгій Мінаеў. Ён добра вывучыў складаную машыну і дзякуючы гэтаму дамогся высокай прадукцыйнасці. Па вечарах Георгій Мінаеў павышае сваю адукацыю ў вячэрняй школе. Сёлета ён закончыць дзесяты клас і атрымае атэстат сталасці.

Фота Ул. Крука.

СВЯТЛЕЕ НА ДУШЫ

Маякі культурнага фронту

Паўлюк ПРАНУЗА

Пасля заканчэння сярэдняй школы дзяўчына не цуралася ніякай працы. Хадзіла на луг грэбці сена, у жніво ўвіхалася ля малатарні. Не сядзела склаўшы рукі і зімой.

У калгасе заўважылі Ірыну, як працавітую дзяўчыну.

Кнігу дзяўчына палюбіла яшчэ ў школе і цяпер не расставалася з ёю. Ідзе на працу, і бярэ з сабою то якую брашуру, то мастацкі твор. Любоў да кнігі падказала ісці вучыцца ў бібліятэчны тэхнікум, які яна паспяхова скончыла.

Першыя крокі самастойнай работы былі нялёгкімі: памяшканне бібліятэкі цеснаватае, неабсталяванае. Хто сюды пойдзе? Чым зацікавіць людзей? — хвалявала маладога бібліятэкара.

Вечарамі ў бібліятэку заходзілі моладзь. Некаторыя юнакі спрабавалі нават у «дурня» рэзацца. А некаторыя прыносілі, як знарок, поўныя кішэні гарбузікаў і трушчылі іх.

— Вопыту работы ў мяне не было, — расказвае Ірына Савасцей. — З чаго пачынаць? Хто можа памагчы? Сама ж усяго не зробіш! — гэтак думала Ірына. А потым, як бы схамянулася:—Вось дзівачка! Школа побач. А колькі выпускнікоў у калгасе, завочнікі — гэта ж тыя людзі, якія вунь як могуць памагчы.

Калі Ірына зірнула ў спісы, аж за галаву схапілася:

— Столькі народу, а чытачоў мала.

Неўзабаве ў бібліятэцы быў наведзены парадак. Прыгожа, з густам расстаўлены на паліцах кнігі, на стале — свежыя газеты, часопісы, на сценах — плакаты, рэкамендацыйныя спісы літаратуры.

У вольную часіну Ірыну заўсёды можна было ўбачыць на брыгадным двары.

— Наш агітатар прыйшоў,— з цеплынёй гаварылі калгаснікі.

Дзяўчына расказвала калгаснікам пра падзеі ў краіне і за рубяжом, а іншы раз разгортвала кнігу і чытала.

Калгаснікі слухалі яе ўважліва. Ірына ў гутарцы высвятляла, хто і чым цікавіцца, што чытае. Часта яна чула і такія словы:

— Часу няма кнігі чытаць, ды ці ў нашы гады імі захапляцца.

Аднойчы Ірына пайшла на поле. Брыдка было глядзець, як некаторыя працуюць. Разам з жанчынамі яна сама ўзялася за работу. Калгасніца Надзея Нагорная паглядзела на бібліятэкарку, сказала:

— Мы самі ўправімся з прапоркай. Вы вунь лепш нам штонебудзь пачытайце.

У час перапынку жанкі прыселі адпачыць. Ірына пачала ім чытаць раман Івана Шамякіна «Трывожнае шчасце». Непрыкметна яна сачыла, як яе слухачы рэагуюць на кнігу. Потым заўважыла, як адна жанчына, схаваўшыся за спіну другой, падносіць да вачэй ражок хусцінкі. Відаць, прачытанае нагадала ёй нешта блізкае, дарагое, а магчыма і балючае...

Назаўтра адвячоркам, ідучы з поля, Надзея Нагорная зайшла ў бібліятэку і сказала Ірыне:

— Дай мне, даражэнькая, тую кнігу, што на полі нам чытала. Вельмі ж спадабалася. Праўда ў ёй пішацца. — Потым падышла да кніжнай паліцы і ўзяла яшчэ аповесць Рамана Сабаленкі «Іду ў жыццё».

— Вы толькі доўга не затрымлівайце кніг, — папрасіла бібліятэкарка: — У нас іх толькі па два экземпляры, а попыт на іх вялікі. Так і пераходзяць з рук у рукі.

Вечарамі ў бібліятэцы станавілася больш людна. То праводзілася якая-небудзь гутарка, то тэматычны вечар. Чытачы бралі не толькі мастацкую літаратуру. Даярак Надзею Марук і Валянціну Олюх зацікавіла брашура «Даяркі-пяцітысячніцы».

Першыя поспехі ў рабоце акрылілі Ірыну, надалі ёй сілы. Але яна не магла задаволіцца дасягнутым. Часта яе трывожыла думка: а як быць з тымі, што далёка жывуць ад бібліятэкі?

Параілася з актывам. Трактарыст камсамолец Мікалай Гуліцкі прапанаваў:

— Давайце мне перасоўку ў вёску Долкінды. Вечарамі буду выдаваць кнігі.

Зачасцілі ў яго дом і моладзь і пажылыя. Узяла з яго прыклад камсамолка Феафанія Зянкевіч. Настаўнікі мясцовай школы таксама не засталіся ў баку: Надзея Паклонская выступіла з лекцыяй «Мы будзем жыць пры камунізме», Яніна Акулік прачытала лекцыю «Шчасце ў працы».

Кніга трывала ўвайшла ў быт хлебаробаў калгаса «Новае жыццё». Няма ўжо ніводнага дома, дзе б не чыталі бібліятэчнай кнігі. Яна стала дарадчыцай, крыніцай ведаў. Неяк Ірына зайшла на плантацыю цукровых буракоў. Была раніца. Жанчыны пачалі прарыўку. Ірына, заняўшы «дзялянку», працавала з імі побач. Але, калі яна ўбачыла, як працуюць жанчыны, спынілася і падышла да адной з іх.

— Пачакайце, што вы робіце? Я вось у кнізе чытала, што трэба па аднаму каліву пакідаць. Кніга гэтая пры мне.

Тут жа знайшла адпаведнае месца і гукнула астатніх:

— Паслухайце, што напісана ў кнізе. Лішнія калівы ў гняздзе пакідаем. — І яна прачытала цэлы абзац.

— Дык нам жа аграном зімою на агратэхкурсах гаварыў пра гэта, — кінула маладая калгасніца. — А мы сваё...

Ірына пачала тлумачыць, як трэба правільна рабіць прарыўку. Жанчыны слухалі ўважліва і хоць не ўсе пагаджаліся з новай прапановаю, але рабілі так, як раіла кніга.

Пазней, калі буракі залапушыліся і пайшлі ў рост, калгасніцы, што рабілі прарыўку, спаткаўшы Ірыну, паведамлялі ёй з радасцю:

— Ты праўду казала, даруй нам, што спрачаліся тады з табой. Цяпер буракам і паветра хапае і сонца. Нішто ім не замінае.

Нялёгкая работа ў сельскага бібліятэкара. Выдаць кнігу — гэта яшчэ не значыць абслужыць чытача. А чытачоў нямала. Розныя людзі і па ўзросту і па характару. Трэба ведаць, чым яны цікавяцца, якая іх адукацыя. Аднаму такая работа не пад сілу. Немалы актыў працуе пры бібліятэцы. За асобнымі чытачамі, састарэлымі людзьмі, замацаваны камсамольцы. Маладая калгасніца Ірына Акулік у вольны час чытае Міхаілу Андросіку «Дрыгву» Якуба Коласа. Такія ж даручэнні выконваюць камсамольцы Люся Самошчанка, Лёля Марук.

Часта заходзяць у Каменскую сельскую бібліятэку «акадэмікі». Так называюць у калгасе тых, хто вучыцца ў Горацкай акадэміі ці ў сельскагаспадарчых інстытутах.

— Што новага атрымалі?— пытаюць яны бібліятэкарку.

Іх цікавяць не толькі мастацкія кнігі, але і навуковыя, якія яны выпісваюць праз бібліятэку з Мінска. Галіна Нагорная, Алена і Леакадзія Шафранскія, Марыя Пракарына хутка атрымаюць вышэйшую адукацыю. Любяць яны зямлю, свой калгас і сваёй працай памнажаюць яго багацце. А вечарамі ў калгасным клубе можна пачуць іх звонкія песні. Некаторыя з іх удзельнічаюць у драматычным гуртку.

Ідуць калгаснікі да Ірыны Савасцей і як да дэпутата сельсавета. Хто пытае парады, хто якой дапамогі. Неяк зайшоў у бібліятэку састарэлы калгаснік. Ірына адзівілася: што магло прывесці сюды гэтага чалавека? А той адразу пачаў расказваць пра сваю бяду:— Стары я, хачу параіцца, як мне трапіць у дом інвалідаў. Памажыце мне.

Ірына ўважліва выслухала старога і не пакінула яго просьбу без увагі, памагла ўладкавацца старому ў дом інвалідаў.

Аднойчы вясною ёй паступіла скарга, што ў краме няма тавараў першай неабходнасці. Па разбітай гразкай дарозе пайшла Ірына ў краму праверыць гэтую скаргу. Крамнік сказаў:

— Бачыце, якая дарога. Ці ж можна што прывезці? Прыйдзецца пачакаць.

— А чаму ж вы не паклапаціліся, каб тавары завезці крыху раней? — перабіла яго пытаннем Ірына. — Ці вы пра людзей забыліся? Каму вы служыце?...

З аганьком працуе Ірына Савасцей у сельскай бібліятэцы. Гэта — сціплы працаўнік. Паважаюць яе ў калгасе. Цяжка нейкай асобнай меркай вымераць яе працу. Яна не водзіць камбайна, не арэ калгаснай нівы, не даглядае арцельнага статку. Але і яе праца відна. Відна ў тым, як чалавек узбагачаецца ведамі, чытаючы кнігі, расце, і ў тым, як святлей робіцца на душы ў хлебаробаў, калі яны чуюць са сцэны калгаснага клуба вясёлую песню ці слухаюць прачулую гутарку на ферме, у брыгадзе. Багацце ад гэтага і душа Ірыны Савасцей. Яна адчувае, што яе сціплая праца памагае калгаснікам у жыцці і адпачынку.

Нясвіжскі раён.

У ГОНАР СТАРЭЙШАЙ БІБЛІЯТЭКІ

У Палацы культуры прафсаюзаў Мінска адбыўся вялікі агульнагарадскі вечар, прысвечаны 40-годдзю Дзяржаўнай бібліятэкі ЗССР. У ім прынялі ўдзел прадстаўнікі прамысловых прадпрыемстваў сталіцы, інтэлігенцыя, студэнты, хатнія гаспадыні. Віншаваць старэйшую бібліятэку прыехалі культасветработнікі Масквы, Ленінграда, Кіева, Вільнюса, Рыгі. Яны зачыталі прывітальныя адрасы старэйшай скарбніцы ведаў Беларусі.

Аб гісторыі ўтварэння ўстановы, аб яе кніжным фондзе і чытачах расказаў прысутным дырэктар бібліятэкі Ф. Сцепанюк. Затым удзельнікі самадзейнасці Палаца культуры далі вялікі канцэрт.

ЖОДЗІНСКІЯ ТАЛЕНТЫ

Пры Палацы культуры Беларускага аўтазавода створан рад самадзейных калектываў — харавы, драматычны, танцавальны, эстрадны аркестр. У іх удзельнічае каля 180 чалавек. У асноўным гэта рабочыя і работніцы завода, члены іх сем'яў. З самадзейнымі артыстамі займаюцца вопытныя музыканты і артысты. Хорам і эстрадным аркестрам кіруюць В. Лінкевіч і І. Перальман, танцавальным калектывам — П. Булдакоў. Заводскія аматары мастацтва паспелі заваяваць любоў у гледачоў не толькі гарадскога пасёлка Жодзіна, але і мінчан. Задорныя, вясёлыя танцы жодзінцаў палюбіліся рабочым аўтамабільнага, трактарнага і радыёзавода.

Да Дэкады самадзейнага мастацтва рэспублікі самадзейнасць Беларускага аўтазавода рыхтуе вялікую тэматычную праграму: «Мы — аўтазаводцы». Музыку да яе напісаў кампазітар Ю. Семяняка.



Выступае харавы калектыў.

Рабочыя завода (злева направа) Э. Урублеўскі і Г. Чалапан развучваюць новы інструментальны нумар.

І. Перальман займаецца з ваналістамі Л. Балашэнка і Л. Новікавай.

Фота Г. УСЛАМАВА. (БЕЛТА).

УСЕСАЮЗНАЯ ВЫСТАЎКА Ў МІНСКУ

Сёння ў Дзяржаўным мастацкім музеі БССР адкрываецца Усесаюзная выстаўка жывапісу, графікі і скульптуры. На ёй прадстаўлена каля 300 работ мастакоў братніх рэспублік, у тым ліку і беларускіх. Гэта толькі частка твораў, якія экспанаваліся летась у маскоўскім манежы. Іх ужо паглядзелі ленінградцы, талінцы, рыжане і вільнюсцы. Другія работы ўключаны ў экспазіцыю, якая робіць падарожжа па маршруту Кіеў — Харкаў — Львоў — Адэса — Баку і г. д. А лепшыя творы, у тым ліку карціны беларускага мастака М. Данцыга «Гудзе зямля салігорская», адпраўлены ў зарубежнае турнэ па заходніх краінах.

Тым не менш, экспазіцыя мінскай выстаўкі дае ўяўленне аб развіцці сучаснага савецкага выяўленчага мастацтва. Разнастайнасць нацыянальных школ, стыляў і тэматыкі прадстаўленых работ раскрывае багацце творчых індывідуальнасцей і імкненняў мастакоў. Выстаўка адлюстроўвае гэтыя радасныя зрухі, як, між іншым, і тыя тэндэнцыі, якія сёння ўжо выглядаюць архаічнымі, шаблоннымі. Таму яна і выклікае спрэчкі і роздум.

ДВАЦЦАЦЬ АМАТАРСКІХ ФІЛЬМАЎ

Каля 20 фільмаў выпусцілі за апошні час аматарскія кінастудыі Магілёўскай вобласці. Яны цяпер шырока дэманструюцца ў рабочых клубах.

Учора ў Магілёве адбыўся першы грамадскі прагляд новых кінакарцін. Высокую ацэнку атрымаў фільм «У музеі Леніна». Ён створан калектывам юных кінематаграфістаў дзіцячага клуба Магілёўскага завода штучнага валакна пад кіраўніцтвам пенсіянера В. І. Багайчука. У мінулым годзе рабяты дзіцячага клуба арганізавалі першы ў вобласці музей Ул. І. Леніна. Многія яго экспанаты прысланы па просьбе дзяцей з Польшчы, Чэхаславакіі, Кітая, Карэйскай Народна-Дэмакратычнай Рэспублікі. Музей стаў любімым месцам школьнікаў. Тут часта праходзяць сустрэчы са старымі камуністамі. Аб усім гэтым і расказваюць кадры фільма.

Значную цікавасць мае карціна «Пералом шыйкі бядра». Яе аўтары — група ўрачоў абласной бальніцы — расказваюць аб новым спосабе хірургічнага ўмяшання і лячэння хворых. Добрае ўражанне пакінулі жыццярадасныя кадры фільма «Заводскія навіны», выпушчанага аматарамі студыі завода пад'ёмна-транспартнага абсталявання імя Кірава. Гэтыя карціны абласное журы вырашыла паслаць на рэспубліканскі агляд.

(БЕЛТА).

ХТО ДЫКТУЕ ГУСТЫ?

Мастацтва ў быт

Мастацкі тэатр, мастацкі музей, мастацкая літаратура. Мы прывыклі адносіцца да гэтых паняццяў з павагай.

А што такое магазін «Мастацкія вырабы»? Фабрыка мастацкіх вырабаў? Наколькі ў дадзеным выпадку слова «мастацкі» адпавядае свайму значэнню?

Перад намі кветкі з паралону і стужак, расфарбаваныя лінючымі анілінавымі фарбамі, «пудовыя» аксамітныя абрусы, упрыгожаныя «залатым шыцём». Перад намі купон жаночай сукенкі, вышыты ўдоўж і ўпоперак, які каштуе не больш не менш як 80 рублёў, наваляччі на падушкі з намаляванымі на іх таўсташчокімі пастушкамі. Можна бясконца працягваць пералік грубасткіх, безгустоўных вырабаў, якія прапануе пакупніку Мінскі магазін мастацкіх вырабаў і на якіх красуецца ярлык: «Белмастакпрамтрэст. Мінская фабрыка мастацкіх вырабаў».

Якія адносіны мае ўся гэта прадукцыя да мастацтва? Хто прыдумвае і зацвярджае падобную безгустоўнасць?

І вось мы на фабрыцы. Мастацкі цэнтр гэтага прадпрыемства — эксперыментальная лабараторыя. Тут мастакі, канструктары, мадэльеры распрацоўваюць новыя ўзоры адзення. Галіна Віктараўна Гарлеа, загадчыца лабараторыі, паказвае нам эскізы, узоры. Ад яе ж мы даведваемся, што фабрыка называецца мастацкай таму, што ўпрыгожвае швейныя вырабы вышыўкай. Але ці ўпрыгожвае?

Галіна Віктараўна шчыра ўздыхае: каму яна патрэбна, гэтая вышыўка! Гарадскі пакупнік яе ўжо амаль не бярэ, і фабрыка працуе на тых, хто адстае ад моды гадоў гэтак на дзесяць.

Загадчыца лабараторыі расказала такую гісторыю. Адна работніца фабрыкі ездзіла неяк у госці на вёску да сваёй знаёмай. Тая пахвалілася абновамі — трыма сукенкамі аднолькавага фасону, аздобленымі адной і той жа вышыўкай, толькі рознага колеру.

Анекдот, але толькі вельмі сумны. Бо за такім вось «патрабавальным» пакупніком ідзе фабрыка, ідуць мастакі, для іх на шоўку і аксаміце вышываюцца бабульчыны і прабабульчыны ўзоры.

Галіна Віктараўна ўспамінае і такі факт. Ёсць у іх мадэль 1956 года. Яе ўжо знялі з вытворчасці. Але да гэтага часу ідуць з раёнаў пісьмы з просьбай аднавіць выпуск гэтай старой і зусім не моднай мадэлі. А калі просяць—чаму не даць. І безгустоўныя рэчы скрозь і ўсюды з'яўляюцца на прылаўках магазінаў.

Але ж калі не будзе ў продажы старых і непрыгодных вырабаў, пакупнік «вымушан» будзе браць моднае і прыгожае!

— Гэта не так проста, — пярэчаць нам работнікі лабараторыі. І гавораць магічнае слова — «план». На жаль, для фабрык Белмастакпрамтрэста ў валавую прадукцыю ўключаецца не толькі кошт апрацоўкі, але і кошт сыравіны. І іменна таму дарагая шэрсць выцясняе танны і модны лён, аксаміт і капрон—палатно. За непатрэбнай вышыўкай часам не відаць і тканіны. І гэта таксама дзеля выканання плана. Аб якой ужо прыгажосці можна тут весці гутарку, калі вышыўка проста наганяе цану.

І яшчэ аб вышыўцы. Пры распрацоўцы ўзораў для яе мастакі абапіраюцца на старадаўнія нацыянальныя беларускія арнаменты. Але адна справа беларускі арнамент на ільняных і баваўняных тканінах, і зусім іншая — на капроне, крэп-жаржэце, крэпдэшыне. Здаецца, мастакі гэта павінны былі б разумець. Аднак на практыцы атрымліваецца наадварот: капрон і шоўк фабрыка атрымлівае ў неабмежаванай колькасці, а лён рэспубліка ільну атрымлівае... з Масквы, прычым вельмі невялікімі партыямі. Лён сёння—модны, але сучасныя і прыгожыя мадэлі, распрацаваныя лабараторыяй, фабрыка выпускаць не можа.

Затое яна выпускае кветкі. Імі завалены цэх і прылаўкі магазінаў. Яны не радуюць вока і, зразумела, не пахнуць. Гэта тыя штучныя кветкі, якія пасля шматлікіх выставак «Цудоўнае ў быт» сталі ў нас сімвалам безгустоўнасці і пошласці. Здавалася б, вытворчасць іх на фабрыцы мастацкіх вырабаў зусім недарэчы. Аднак тут стварэннем гэтых немастацкіх вырабаў займаецца цэлы цэх — 43 чалавекі. Чаму? Аказваецца, Белмастакпрамтрэст імкнецца задаволіць густы ўсё таго ж пэўнага пакупніка, які, нягледзячы ні на што, працягвае купляць гэты тавар.

— Не прывозіць жа іх з Урала,—заўважыла нам упраўляючая трэста В. А. Кенгурава.

— А можа, іх наогул не трэба вырабляць і прадаваць? —спрабуем мы пераканаць дырэктара мастацкага магазіна.

Ёсць жа мноства людзей, у якіх уяўленне аб прыгожым складаецца такім чынам: раз у магазіне прадаецца, значыць, яно і прыгожае і патрэбнае. А задача магазіна мастацкіх вырабаў — не толькі прадаваць тое, што купляюць, але і выхоўваць густы, мастацкае пачуццё, змагацца з пошласцю і мяшчанствам!

Аднак з намі не згаджаюцца.

— Кветкі—гэта ж прыгожа, —пярэчаць і дырэктар і прадаўшчыцы.

І гэта самае сумнае. Бо ад таго, хто стаіць паміж вытворчасцю і пакупніком, залежыць часам не менш, чым ад мастакоў-мадэльераў. Яны, работнікі магазіна «Мастацкія вырабы», павінны быць людзьмі з мастацкімі ведамі ці хоць бы з добрым густам, бо адна справа гандляваць селядцамі, а іншая — вырабамі мастацтва, няхай не ў крыўду гэта будзе сказана. Ды і не да крыўды тут, бо гаворка ідзе аб важнай дзяржаўнай справе — культурным выхаванні народа, аб задавальненні яго эстэтычных патрабаванняў. І ўжо калі работнікі фабрыкі і трэста, адстайваючы тыя кветкі, спасылаюцца на патрабаванні пакупніка, то чаму б ім не звярнуць увагі на тое ненармальнае становішча, якое склалася з цэхам мастацкага вязання пры атэлье Беларускага мастацкага прамысловага трэста? Цэх гэты выконвае заказы на вязаныя вырабы ад насельніцтва. Прычым выконвае нядрэнна, і прадукцыя яго карыстаецца вялікім попытам. Дастаткова сказаць, што чарга заказчыкаў у атэлье сёння складаецца з трох тысяч чалавек. І пры цяперашніх тэмпах выканання заказаў яны будуць задаволены толькі да 1965 года!

А гавораць аб задавальненні запатрабаванняў. Якое ж гэта задавальненне? Чаму б не расшырыць цэх вязання хоць бы за кошт таго ж кветкавага цэха або цэха вышыўкі? Чаму б акрамя выканання індывідуальных заказаў фабрыцы не пастаўляць свае вязаныя вырабы—шапачкі, шарфы, кофты, світары, вязаныя камплекты і гарнітуры ў свой магазін мастацкіх вырабаў замест той жа вышыўкі, якой ніхто не бярэ. Шарсцяныя вязаныя вырабы ручной работы цяпер вельмі модныя, яны прыгожыя, практычныя. Урэшце рэшт яны далі б трэсту значна большы даход, чым ужо апісаныя «прыгажосці» фабрыкі.

У цэху вязання толькі трыццаць вязальшчыц. У адным невялікім пакоі праводзіцца і афарбоўка, і сушка, і апрацоўка шэрсці і гатовых вырабаў. Тут жа працуюць і вязальшчыцы. Умовы работы нікуды нявартыя. Кіраўнікі атэлье і трэста неаднаразова звярталіся ў гарвыканком з просьбай прадаставіць вязальнаму цэху другое памяшканне. Але выканком глухі да гэтых просьбаў. Аднак, пакуль удасца знайсці

(Заканчэнне на 2-й стар.).

РЫХТУЮЦЦА ДА ДЭКАДЫ

У аматараў хору, танцаў і драмы Пінска цяпер гарачы час. Яны рыхтуюцца да Дэкады самадзейнага мастацтва рэспублікі. Больш 60 розных самадзейных калектываў горада будуць змагацца за права выступаць на сталічнай сцэне. Харавыя і танцавальныя гурткі, эстрадныя аркестры, драматычныя калектывы працуюць на мясакамбінаце, заводзе штучных скур, у педагагічным вучылішчы, пры гарадскім Доме культуры і на розных прадпрыемствах. Хор палескай песні развучвае новыя творы беларускіх кампазітараў.

Днямі адбылося пасяджэнне гарадской камісіі, на якой было вырашана пачаць прагляд самадзейных калектываў горада 1-га кастрычніка.

СМЕРЦЬ МІКАЛАЯ ПАГОДЗІНА

19 верасня на ўзросце 62 год памёр Мікалай Фёдаравіч Пагодзін, выдатны савецкі драматург, аўтар многіх п'ес і кінасцэнарыяў, што назаўсёды ўвайшлі ў гісторыю савецкай драматургічнай літаратуры.

(ТАСС).

ЗНЯВАГА ПІЛЬНАСЦЮ

А. УЛАДЗІМІРАВА

★ ★ ★

Гады, як пацеркі... Нярэдка прыходзіла на памяць гэтае вобразнае параўнанне паэта. Але ніколі не думалася, што калі-небудзь яно здолее ажыць, стаць рэальным ці, калі хочаце, нават матэрыяльным. На стале паперкі, пасведчанні, дакументы, выпіскі з загадаў. Пажоўклыя зусім і пажоўклыя толькі трошкі, на шэраватым кардоне вытворчасці гадоў гэтак дваццатых, і на добрай вашчонай паперы пасляваеннага выпуску... Усё жыццё чалавека ўмясцілася ў гэтай грудзе дакументаў. Якім жа доўгім можа быць яно, калі ўвабрала ў сябе столькі падзей, столькі гістарычных фактаў. Для гэтага зусім не абавязкова быць занадта старым, дастаткова проста нарадзіцца ў 1905 годзе, годзе першай рускай рэвалюцыі, а потым увесь свой шлях вымяраць не толькі даўжынёй гадоў.

Вось яны, яго дакументы. Пасведчанне ўдарніка, напэўна, адно з першых пасведчанняў такога тыпу ў краіне. Даволі вялікая кніжачка за нумарам 03755. Чамусьці асабліва кранае гэты нумар. Значыць, яшчэ не так многа ў самым пачатку трыццатых гадоў было выдадзена такіх вось пасведчанняў, калі малады токар Харкаўскага трактарнага завода Пётр Літвін стаў уладальнікам нумара, што не дацягнуў нават да чатырох тысяч. А потым яшчэ адно пасведчанне, больш сціплае з выгляду, але, думаецца, не менш значнае, — пасведчанне рабочага-рацыяналізатара. І яшчэ адно — удзельніка стаханаўскага руху. Побач з пасведчаннямі — загады. Вельмі цікавыя загады, аб пераводах з аднаго месца працы на другое. Чытайце: у іх подых самой гісторыі. Харкаўскі трактарны... Чалябінскі трактарны... Алтайскі трактарны... Рубцоўскі трактарны... І, нарэшце, Мінскі трактарны завод. Подых гісторыі, і подых рамантыкі тых гадоў, калі рабочы клас узняў магутны молат індустрыялізацыі краіны.

Гады, як пацеркі... Толькі пацеркі няроўныя і неаднолькавыя. Ёсць сярод іх больш бліскучыя, ёсць і крыху злінялыя. Ёсць падобныя на сапраўдныя дыямэнты, і ёсць падобныя на дробны, засушаны гарох. Такія хочацца хутчэй змахнуць рукой, як некаторыя з гэтых паперак, што ляжаць на стале («Калі-небудзь, будзе час, раскажу падрабязна, што са мной здарылася ў такім вось годзе»), і зноў нанізаць на суровую, моцную нітку памяці. Нанізаць, але не выкінуць. Бо гэта яго жыццё. Яго шлях, яго радасці і засмучэнні, узлёты і расчараванні. Я не стала дапытвацца, улазіць у душу чалавека, не даўшы волі натуральнай у такіх выпадках цікавасці: а ўсё-такі што ж здарылася ў тым годзе? Пётр Іванавіч пачынае сам.

...Гэта даўняя і сумная, але, здаецца мне, па-свойму ўсё ж цікавая гісторыя. Малады рабочы з пасведчаннем ударніка за нумарам 03755 быў запрошан на адну незвычайную, але характэрную для таго часу вытворчую нараду. Яе праводзіў чалавек, імя якога доўга яшчэ з любоўю і павагай будуць называць старыя кадравыя рабочыя машынабудаўнічай прамысловасці, бо многія з іх ведалі яго асабіста — Сярго Арджанікідзе.

— Ен паставіў перад намі задачу, — Пётр Іванавіч і цяпер з нейкай асаблівай цвёрдасцю і гонарам вымаўляе гэтыя словы: «паставіў перад намі задачу» з націскам на слова «намі», — палепшыць эканамічнасць работы пнеўматычных фармовачных машын.

З групай вучоных і інжынераў завода Літвін непасрэдна ў сваім цэху пачаў праводзіць выпрабаванні, даследаванні, эксперыменты. І не мог супакоіцца, пакуль не знайшоў тое, над чым білася цэлая група вучоных з вядомымі імёнамі. Здарылася так, што яго вывады і разлікі абвяргалі вывады і разлікі вядомых вучоных у галіне машынабудаўнічай вытворчасці. Замест павелічэння так званых шкодных плошчаў (прыйдзецца ўжыць, напэўна, не ўсім зразумелыя тэхнічныя тэрміны), Літвін прапаноўваў знішчыць гэтыя плошчы і дазіраваць паветра. Сам вырашыў правесці выпрабаванні і пераканаць тых, хто не згаджаўся з такім рашэннем праблемы. Узяў старую, ужо знятую з вытворчасці машыну, прыстасаваў да яе спецыяльны клапан і папрасіў вопытных рабочых некаторы час папрацаваць на гэтай машыне. Эфект, як гаварыць, перавысіў усе чаканні. Рабочыя адмовіліся працаваць на ўсіх іншых машынах, дзе няма «клапана Літвіна», і хутка новае абсталяванне атрымала ў цэху, здавалася б, надзейную прапіску. Пачалося афармленне аўтарскіх правоў на вынаходніцтва.

Але аднойчы ў цэху здарылася аварыя. Машына, на якой быў клапан Літвіна (ён так называецца і цяпер — клапанам Літвіна), пачала даваць брак, потым зусім выйшла са строю. Кампетэнтная камісія вынесла сваё заключэнне, і вынаходніцтва маладога рабочага адразу ж набыло свой, вельмі небяспечны ў той час ярлык. Яго назвалі шкодніцкім.

Вы ведаеце, што ў 1936—37 гадах значыла гэта слова «шкодніцтва»? Пасля «размовы» ў пэўных органах, аднойчы ноччу Літвін цішком прабраўся ў свой цэх і зняў з усіх станкоў свой клапан, сваё дзецішча. Зняў і ўсю ноч аж да світання праседзеў у цэху, ногі не слухаліся, не мог пайсці дамоў, быццам толькі што пахаваў вельмі блізкага, роднага чалавека... А назаўтра раніцою, калі ў цэху заўважылі, што клапаны зніклі, і калі высветлілася, што машыны адразу ж пачалі працаваць горш, Літвіну «прыпісалі» яшчэ больш страшэннае, яшчэ больш небяспечнае злачынства. Занадта пільныя людзі абвінавацілі ў наўмысным, зноў-такі варожым «выпадзе» — у зрыве стаханаўскага руху...

...А потым зноў пайшлі за годам год. Сам Літвін ніколі нідзе не рашаўся ўспомніць пра гэты злашчасны клапан. І толькі пасля вайны, калі яго накіравалі працаваць на Мінскі трактарны завод, уся гэтая гісторыя ўсплыла зноў, усплыла ў самым нечаканым, трэба сказаць, шчаслівым варыянце. Малады трактарны завод сутыкнуўся з той жа праблемай — недастатковай эканамічнасцю пнеўматычных фармовачных машын. Пачаліся пошукі ў тэхнічнай літаратуры, падручніках. У адным з іх, які быў выдадзен ужо ў канцы 40-х гадоў, падрабязна апісваўся «клапан рабочага Літвіна», прыводзіліся выкладкі яго эканамічнасці, указвалася, што амаль на ўсіх трактарных заводах машыны маюць цяпер гэтае прыстасаванне.

— Ну як гэта вы маўчалі дасюль? Нам жа так патрэбны ваш клапан...— з дакорам сказаў Літвіну дырэктар завода.

Пётр Іванавіч на хвіліну нізка апусціў галаву, а калі ўзняў яе, то на твары разам з многімі іншымі пачуццямі свяцілася гордасць, гордасць рабочага чалавека, імя якога ўсё ж, нягледзячы ні на што, ўвайшло ў гэты тоўсты падручнік па машынабудаванню.

І зноў знайшліся занадта пільныя людзі. «Баталію» з імі не перакажаш, бо нават не перачытаеш у адзін заход тую шэрую папку з дакументамі, перапіскай, даведкамі і яшчэ бог ведае чым, якую сам Літвін называе цяпер «справай аб маім вынаходніцтве»... Урэшце рэшт справядлівасць была ўстаноўлена. Прыгожая кніжачка, вельмі падобная на пасведчанне аб узнагародзе ордэнам, пацвярджае цяпер аўтарскія правы Літвіна на вынаходніцтва. Хаця з таго часу, як у цэху Чалябінскага трактарнага завода на адной са старых зношаных машын быў устаноўлен цудадзейны клапан, прайшло ледзь не чвэрць стагоддзя...

Расказам сваім Пётр Іванавіч нагадаў той час, аб якім толькі цяпер людзі пачалі ўспамінаць смела і без боязі, успамінаць з болем і горыччу. То прарвецца гэты боль праз радкі апавяданняў у свежым нумары газеты ці часопіса, то праз нататкі пра слябра-пісьменніка з дакументальнай скупой трагічнасцю слоў: «Ён мог бы напісаць многа кніг...» Вам не здаралася задумвацца, чаму імённа цяпер, калі ўсе мы так глыбока, так непахісна перакананы, што той час ніколі не вернецца на нашу зямлю, чаму ж мы ўсё ўспамінаем і ўспамінаем, чаму іншым разам нават занадта ўжо дэталёва перабіраем у памяці падзеі, аналізуем паводзіны і пачуцці людзей у тыя часы? Не толькі ж, напэўна, для таго, каб паведаміць патомкам пра нашу трагедыю, і нават не для таго, каб адно раскрыць сённяшняму пакаленню старонку ўжо даволі далёкай гісторыі....

Людзям мала таго, што цяпер кожны чалавек, які жыве сумленна і сумленна працуе, можа спакойна падняцца ноччу з ложка і адчыніць дзверы на неспадзяваны стук. Людзі не жадаюць, каб хоць што-небудзь, хоць самым далёкім адгалоскам нагадвала той стыль, той дух, тую атмасферу, калі чалавек мог падазрона касіцца на другога чалавека, калі твая годнасць, твой гонар, твая асоба магла быць зняважана самым бяскрыўдным на першы погляд чынам, нават з такога поваду, што «закон ёсць закон». Людзі і самі добра ведаюць, што «закон ёсць сапраўды закон», але не жадаюць — і правільна робяць! — лічыць, што ён існуе толькі для таго, каб прынізіць чалавека сваёй суровай пільнасцю. Цяпер здаецца, што нават самыя сухія параграфы законаў нібы пацяплелі, павярнуліся тварам да людзей. Толькі б самі людзі, усе тыя, хто пастаўлен паміж законам і чалавекам, ніколі не забываліся аб гэтым і не жылі па старой звычцы, па інерцыі. Але сярод гэтых людзей сустракаюцца і такія, хто ўсё ж забываецца аб тым, што прыйшоў іншы час.

На такі вось роздум мяне навяла гісторыя Літвіна. Не першая, аб якой ужо расказана, а другая, аб якой яшчэ трэба расказаць. З поваду яе, другой гісторыі — зноў гісторыі пра абразлівую пільнасць — і нарадзіўся на свет гэты артыкул.

..У рэдакцыю прыйшла жанчына. Прыйшла і ледзь не за руку павяла аўтара гэтых радкоў на кватэру да Пятра Іванавіча Літвіна. Ледзь не за руку, бо, прызнацца, пры словах: «гутарка пойдзе аб пенсіі» журналісцкая зацікаўленасць тэмай не вельмі ўзрастала.

(Заканчэнне на 4 стар.).

ДА 80-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ ЯКУБА КОЛАСА

У Літаратурны музей Якуба Коласа паступіў цікавы фотаздымак. Яго перадаў жыхар горада Дзяржынска Хведар Ігнатавіч Калечыц, які разам з Якубам Коласам вучыўся адзін год у Нясвіжскай настаўніцкай семінарыі. Якуб Колас перад заканчэннем семінарыі быў назначан старшым групы маладых, у якой знаходзіўся Хведар Ігнатавіч.

Прайшло шмат год. У 1926 годзе ў адной са школ горада Мінска адзначалася 20-годдзе з дня арганізацыі і правядзення настаўніцкага з'езда ў Мікалаеўшчыне. У юбілеі прыняў удзел і Хведар Калечыц. Тут ён зноў сустрэўся з Якубам Коласам, пабачыўся з удзельнікам з'езда Янкам Маўрам. Народны паэт пасля пасяджэння запрасіў Хведара Ігнатавіча да сябе на кватэру. Там яны ўспомнілі семінарскія гады, расказалі аб сваім жыцці, аб рабоце. У той час яны і сфатаграфаваліся. На здымку, які друкуецца ўпершыню, вы бачыце Якуба Коласа, Янку Маўра, Хведара Калечыца і іншых.

ПІСЬМЫ І ФАТАГРАФІІ ПЕСНЯРА

Нядаўна жонка беларускага пісьменніка Максіма Гарэцкага — Чарняўская Леаніла Усцінаўна і іх дачка — Гарэцкая Галіна Максімаўна перадалі Літаратурнаму музею Якуба Коласа Акадэміі навук БССР цікавыя дакументы: тры фатаграфіі Якуба Коласа 20-х гадоў, сярод якіх даве групавыя, два яго пісьмы (ад 17.IV.1927 г. і 9.XI.1927 г.) і пісьмо жонкі Канстанціна Міхайлавіча — Марыі Дэмітраўны да Леаніды Усцінаўны ў Вятку ад 24.XI.1932 г., у якім паведамляюцца некаторыя цікавыя звесткі з жыцця коласавай сям'і.

На асобнай фатаграфіі ёсць аўтограф паэта: «Дарагому Максіму Іванавічу Гарэцкаму. Якуб Колас. 26.IV.1925 г.». Другая фатаграфія адносіцца да 1925 года, на ёй мы бачым Якуба Коласа, Змітрака Бядулю, Цішку Гартнага, Максіма Гарэцкага сярод членаў гуртка беларускай культуры рабфака Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Тэці здымак зроблен ў 1927 годзе ў Горках, дзе Якуб Колас сфатаграфаваны з групай жанчын-беларусак, сярод якіх — Паўліна Мядзёлка, Леаніла Чарняўская і іншыя. Ім жа ў пісьме ад 9.XI. 1927 г. паэт пісаў:

«Я не знаходжу адпаведных слоў, каб выказаць Вам, мілыя жанчыны-беларускі, маю радасць і маю падзяку за павіншаванне, а таксама не магу звярнуцца да Вас, як бы гэта трэба было. Назаву хіба Вас гэтак:

«Цвет і краса жанчын
Беларускай зямлі!»

З гэтага Вы і пачынайце чытаць маё гэтае пісьмо... Пішу трохі нескладна, можа ад таго, што пагода такая паганая, гнілая, санлівая, і сам я не зусім здаровы. Пачала балець мая нага. Дзён пяць не ўставаў з пасцелі, і ўжо з месяц часу, як хаджу я, пакульгваючы. Першы раз у жыцці чую, што ў мяне ёсць левая нага і што не яна мяне носіць, а я яе. Застудзіў недзе. А можа гэта старасць пляце на мяне свае сеці. Журботна гэта, але што ты зробіш? Работа ў мяне ідзе марудна. І зноў жа такі мушу зазначыць, што гэта першы такі мой год у Мінску, калі прадукцыйнасць мае работы значна паніжана. На гэта, вядома, ёсць важкія прычыны, але казаць Вам аб іх нецікава. Пачаў пісаць адно апавяданне ды адлажыў, узяўся за другое. Як відаць, ужо да канца гэтага года за сур'ёзную работу так і не вазьмуся, а ўжо з новага году засяду за сваю паэму. Тады я зноў ажыву. Чакаю, калі выйдзе з друку другая часць «Палескай глушы». Тады кожнай з Вас прышлю па кнізе, бо Вы такія мілыя і слаўныя, што калі толькі пачнеш аб Вас думаць, дык весялей і святлей робіцца на сэрцы. Мяне вельмі цешыць, што ў Вас ёсць цёплыя хаты, і ў гэтых хатах калядамі я маю замах пабыць, каб паглядзець на Вас і пагутарыць у Вашай мілай кампаніі. Калі надыдзе гэтакі час, то я паведамлю Вас пісьмом. Навін такіх асаблівых няма. Жывуць людзі патроху. Нельга сказаць, каб жыццё гэтае з майго погляду было цікавае, дык я больш сяджу дома. У бліжэйшыя дні думаю пераехаць ужо ў сваю хату, а Ваш абавязак — быць у Мінску і даведацца да мяне.

Шчырае прывітанне дзядзьку Максіму. Я, прызнацца, часта думаў над тым, што яму трэба напісаць ліст, але ўсё нейак не сабраўся. Паклон і Гаўруку.

А цяпер дазвольце шчыра паціснуць Вашы рукі і пацалаваць Вас хоць у сваіх думках.

Бывайце шчаслівыя і вясёлыя.

Шчыра адданы
Ваш Якуб Колас».

Другое пісьмо Якуба Коласа, адрасаванае Леаніле Усцінаўне Чарняўскай, мае наступны змест:

«Глыбокаважаная Ляонія Усцінаўна!

Шчыра дзякую Вам за Ваша пісьмо. Я не спускаў з мыслі свайго абяцання заехаць у Горкі. Мусі быць, не дачакаюся я, пакуль распусцяцца на бярозах лісточкі, і прыеду раней. Калі б вясна не запазнілася так, то мой прыезд у Горкі супаў бы якраз з часам распускання бярозавых лісцяў. Я думаю прыехаць у Горкі 24.IV, бо іншага часу выбраць мне трудна. Выеду ў суботу 23.IV у 10 г. 50 м., а ў Горках буду 24 раніцаю. Прывітанне дзядзьку Максіму і мілым жанчынам-беларускам. Усяго найлепшага.

Якуб Колас.
17.IV.1927 г.»

Мікола БАЗАРЭВІЧ,
навуковы супрацоўнік Літаратурнага музея Я. Коласа.

ХТО ДЫКТУЕ ГУСТЫ?

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

свабоднае і прасторнае памяшканне для цэлага цэха, што не так лёгка, трэба даўно было праявіць самім ініцыятыву і пераглядзець уласныя рэзервы, — за кошт скарачэння адных павялічыць другія. Такая манеўранасць зусім у духу часу.

Мы пазнаёміліся з работай адной фабрыкі мастацкіх вырабаў, але, відаць, не лепш справа абстаіць і на ўсіх астатніх дваццаці, якія падначалены Белмастакпрамтрэсту. Аб гэтым сведчаць і жлобінскія саламяныя шкатулкі, і цяжкія нязграбныя керамічныя вазы з Івянца, і навалачні з Гродна. Гэтыя непатрэбныя, непрактычныя прадметы пакаёвага быту дапаўняюць у мастацкім магазіне швейныя вырабы.

Дзе ж пачынаецца жыццё гэтых вырабаў? Новымі мадэлямі і лекаламі ўсе прадпрыемствы мясцовай прамысловасці забяспечвае швейная эксперыментальная лабараторыя. Яна знаходзіцца тут жа, на тэрыторыі фабрыкі. Эскіз будучага вырабу нараджаецца тут. І не дзіва, што ў гэтай вялікай установе мы сутыкнуліся з тымі ж праблемамі, якія хвалююць калектыў і фабрычнай лабараторыі. Сапраўды, усім надакучыла вышыўка, па меры сіл яе імкнуцца рабіць простай, сучаснай, недарагой. Сапраўды, мадэлі прайграюць ад абмежаванага і аднастайнага асартыменту тканін, якія пастаўляе «Тэкстыльгандаль». Сапраўды, ад думкі мастака да гатовага вырабу адлегласць такая вялікая, што за гэты час самыя навейшыя мадэлі паспяваюць састарэць. Нарэшце, кадры і абсталяванне недастаткова падрыхтаваны і да манеўранасці, якая настойліва дыктуецца жыццём, і да забеспячэння добрай якасці вырабаў.

Мастак-мадэльер па адзенню Ніна Васільеўна Ерэянкова і кіраўнік групы прыкладнога мастацтва Алена Іосіфаўна Красічкава прыводзяць нам прыклады. «Тэкстыльгандаль» пастаўляе тканіны ўзору 1950 года. Новая фактура, новыя матэрыялы, якія скарыстоўваюцца для стварэння сучасных тканін, модныя расфарбоўкі пад увагу мастакамі лабараторыі не прымаюцца. Яны маюць справу з гладкаафарбаванымі шаўкавістымі тканінамі тыпу «прыма» і «аіда». У апошні час у невялікіх колькасцях ім даюць ільняныя тканіны. З імі працаваць больш прыемна і цікава. Мадэлі на ільне недарагія, прыгожыя, сучасныя. У іх паспяхова выкарыстоўваецца такая неабходная фабрыцы вышыўка. Гэта, напэўна, адзінае сур'ёзнае новаўвядзенне, адобранае мастацкім саветам і фабрыкамі за апошні год.

Але паглядзіце, якая доўгая яго дарога да пакупніка. Палатняная сукенка (мадэль 86-62) з кішэнькай ручной вышыўкі зацверджана мастацкім саветам 28 красавіка, маладзёжная сукенка з вышыўкай на блузе (мадэль 85-62) зацверджана 28 красавіка, палатняная сукенка для дзяўчынак-старшакласніц з прыгожым малюнкам аранжавых і карычневых таноў (мадэль 2-62) зацверджана 26 лютага. Цана гэтых вырабаў крыху больш за дзесяць рублёў. Што больш прыгожае і практычнае можна было б прапанаваць моладзі да летняга сезона? Але прыйшла восень, а гэтыя мадэлі і лекалы ўсе прадпрыемствы мясцовай прамысловасці забяспечваюць швейнай эксперыментальнай лабараторыі. Яна знаходзіцца тут жа, на тэрыторыі фабрыкі. Эскіз будучага вырабу нараджаецца тут. І не дзіва, што ў гэтай вялікай установе мы сутыкнуліся з тымі ж праблемамі, якія хвалююць калектыў і фабрычнай лабараторыі. Сапраўды, усім надакучыла вышыўка, па меры сіл яе імкнуцца рабіць простай, сучаснай, недарагой. Сапраўды, мадэлі прайграюць ад абмежаванага і аднастайнага асартыменту тканін, якія пастаўляе «Тэкстыльгандаль». Сапраўды, ад думкі мастака да гатовага вырабу адлегласць такая вялікая, што за гэты час самыя навейшыя мадэлі паспяваюць састарэць. Нарэшце, кадры і абсталяванне недастаткова падрыхтаваны і да манеўранасці, якая настойліва дыктуецца жыццём, і да забеспячэння добрай якасці вырабаў.

Мастак-мадэльер па адзенню Ніна Васільеўна Ерэянкова і кіраўнік групы прыкладнога мастацтва Алена Іосіфаўна Красічкава прыводзяць нам прыклады. «Тэкстыльгандаль» пастаўляе тканіны ўзору 1950 года. Новая фактура, новыя матэрыялы, якія скарыстоўваюцца для стварэння сучасных тканін, модныя расфарбоўкі пад увагу мастакамі лабараторыі не прымаюцца. Яны маюць справу з гладкаафарбаванымі шаўкавістымі тканінамі тыпу такі, пры агульным жаданні мастакоў, выканаўцаў і пакупнікоў бачыць адзенне модным і прыгожым, не здымаюцца з вытворчасці мадэлі 1957, 1959, 1960 гадоў? Чаму не выкарыстоўваюцца новыя тканіны? Чаму не ўмацоўваецца атрад людзей, занятых распрацоўкай тэхналогіі? На гэтыя пытанні на фабрыцы нам далі толькі адзін адказ: наш пакупнік моду не прызнае. А пра тое, што густ гэтага пакупніка трэба ўсё-такі выхоўваць, ніхто чамусьці не гаварыў.

Аб гэтым мала думаюць і ў самім Белмастакпрамтрэсце. З нашай заўвагай аб тым, што ў магазіне мастацкіх вырабаў шмат безгустоўных грубых рэчаў, В. А. Кенгурава, кіраўнік трэста, ахвотна згаджаецца:

— Трэба пайсці паглядзець, што там у іх робіцца, і прымусіць убраць лішняе.

А хіба гэта цяжка было зрабіць раней? Некаторыя ж тавары ляжаць у магазіне не дні і месяцы, яны захоўваюцца гадамі. Як паведаміла нам галоўны інжынер трэста, на прадпрыемствах толькі 15—20 працэнтаў сучасных вырабаў. Няўжо гэта лічба не хвалюе кіраўніцтва Белмастакпрамтрэста?!

З новага года ў рабоце мастацкай фабрыкі павінны адбыцца вялікія змены. Перш за ўсё, яна перастане шыць адзенне і будзе мець магчымасць цалкам спецыялізавацца на вырабах, якія ўпрыгожаць наш быт. Але калі гэта будзе рабіцца ранейшымі сіламі, калі баявым клічам па-ранейшаму застанецца: рабі, што бяруць, г. зн., калі фабрыка па-ранейшаму будзе кіравацца самымі пасрэднымі густамі — наўрад ці становішча зменіцца. Мастацкі промысел існуе не толькі на выгаду рынку. Гэта традыцыя, гэта нацыянальная гордасць. І не трэба, прыкрываючыся словам «мастацкі», ператвараць яго ў грубую халтуру.

В. АКУНЬКОВА,
Т. АРЛОВА.

На „Гомсельмашы"

На заводзе «Гомсельмаш» пачаў працаваць кіналекторый «Мастацтва належыць народу». Першую лекцыю «Мастакі-перасоўнікі» прачытаў мастацтвазнаўца т. Сырамятнікаў. Пасля лекцыі слухачам лекторыя быў паказан кінафільм «У Траццякоўскай галерэі».

* * *

Падведзены вынікі конкурсу-агляду творчасці самадзейных мастакоў і фотааматараў «Гомсельмаша». Звыш месяца ў заводскім Палацы культуры дэманстравалі ся працы мастакоў — наладчыка малярнага абсталявання аддзела галоўнага тэхнолага Івана Міхайлава, рабочага ліцейнага цэха коўкага чыгуну Міколы Чумакова, мастака Палаца культуры П. Хацімцава, фотаздымкі з жыцця, працы і вучобы камбайнабудаўнікоў токара другога механазборачнага цэха Міколы Худалеева.

Удзельнікі заводскага конкурсу-агляду атрымалі прэміі.

В. СЯМЁНАЎ.

П. МАКАЛЬ

НА НЕСПАКОЙНЫХ ХВАЛЯХ ЭПОХІ

Ці патрэбна ў наш час мастацтва? Здавалася б, каму ў галаву прыйдзе такое пытанне... А між тым, менавіта яно ўсяго некалькі год назад выклікала цэлую шумную дыскусію **фізікаў і лірыкаў**. І хоць відавочнай была марнасць намаганняў тых, хто спрабаваў давесці; быццам мастацтва зараз дажывае свае дні, размова гэтая ўзнікла не выпадкова. Апошнія дасягненні навукі і тэхнікі настолькі грандыёзныя, што абыякавым да іх не можа застацца, бадай, ніводзін жыхар планеты. Подзвігу першых касманаўтаў апладзіравала ўсё чалавецтва. Трэба прызнаць, што ў параўнанні з гэтым поспехі сучаснага мастацтва даволі сціплыя. Да сваіх зорных вышынь, у свой «космас» лірыкі, відаць, яшчэ не прыніклі.

Рэактыўныя хуткасці скарацілі адлегласці паміж кантынентамі і народамі. Аднак яшчэ больш акрэсліўся водападзел паміж двума сусветнымі лагерамі, паміж двума светамі. З аднаго боку — праграма небывалага росквіту грамадства. З другога — пагроза ядзернай катастрофы. У гэтым адна з галоўнейшых супярэчнасцей эпохі. У гэтым крык часу. Быць ці не быць? — гэтае гамлетаўскае пытанне паўстае зараз перад усім чалавецтвам. І таму, мне здаецца, не будзе перабольшаннем сказаць, што наш век — гэта ў пераважнасці век **думкі**. Маштабнасці мыслення, філасофскага роздуму над жыццём, шырыні мастацкіх абагульненняў — вось чаго вымагае зд лірыкаў час. Няцяжка заўважыць, што якраз гэтымі вартасцямі вылучаюцца найбольш буйныя з'явы савецкай паэзіі апошніх год — «Сярэдзіна веку» Лугаўскога. «За даллю — даль» Твардоўскага, «Чалавек» Межалайціса... Цікава, што ўжо самі назвы гэтых твораў, як бы акцэнтуюць у сабе тое галоўнае, што займае ці, ва ўсякім разе, павінна займаць сучаснага мастака: **час, чалавек і яго поступ...**

Чытач хоча, каб паэзія акрыляла яго, вымагала адказваць на тыя баляючыя і складаныя пытанні, якія штодзённа ставіць жыццё. Вядома, патрабаванне, каб паэзія абуджала сур'ёзны роздум пра наш час, зусім не азначае, што яна пазбаўляецца права на так званыя інтымныя тэмы, на звычайныя «адвечныя» людскія радасці і пакуты. Гаворка хутчэй пра тое, што ў самым падыходзе да з'яў рэчаіснасці павінен прысутнічаць погляд сучасніка. Значнасць жа той ці іншай тэмы пасапраўднаму вызначаецца толькі ў яе мастацкім выкананні. Вазьміце хоць бы пакарэнне космасу. Больш удзячную тэму, бадай, цяжка і знайсці. Здавалася б, дзе ўжо болей прастору для думкі! Дарэчы, большасць з вершаў, напісаных на гэтую тэму, не абвінаваціш у сухасці, у коснасці. Клічнікавымі інтанацыямі яны проста-такі перанаселены. Паэты на ўсе лады скланяюць словы «арбіта», «прыцягненне», «ракета»... І ўсё ж творы атрымліваюцца, калі карыстацца касмічнай тэрміналогіяй, часцей за ўсё бязважкімі. Чаму? Гэтым вершам нестае палёту думкі, не хапае пранікнёнасці паэтычнай і філасофскай. Касмічныя палёты — гэта зорныя гадзіны, зорныя суткі. Але за імі — гісторыя. Вякі. Ад Ікара да Гагарына адлегласць у тысячагоддзі. Гэта трэба асэнсаваць. Могуць сказаць: дайце час, маўляў, усю веліч падзеі ўсвядоміш, толькі зірнуўшы на яе з далечыні. Думаю, што тэорыю «дыстанцыі» літаратары павінны аддаць гісторыкам. Ва ўсякім разе, яна не для паэтаў. Наўрад ці ёсць патрэба прыводзіць прыклады, калі творы, напісаныя, як люблюць гаварыць крытыкі, па гарачых слядах падзей, рабіліся з'явамі ў літаратуры.

Яшчэ планету апярэзвалі толькі першыя спадарожнікі, яшчэ свет не ведаў ніводнага з імён зорнай сям'і касманаўтаў, а мы з хваляваннем чыталі:

Вякамі глядзелі жанкі з-пад рукі,
Чакалі мужоў і сыноў.
І падалі зоркі, нібы светлякі,
У прорву бязрадасных сноў.
І самі касілі, і самі аралі,
А іх дарагія за іх памралі.
Бялелі, як цвет той, іх чорныя косы,
І спежні у сад зарасталі...
І заўтра, як вырвуцца людзі у космас,
Іх гора лягчэйшым не стане.
Мы будзем усе стратанаўтаў вітаць,
А маткі — пякучыя сёзы глытаць,
Глядзець усю ноч ім да ранняй зары
У халодныя вочы сусвету
І думаць — ці зорна сягоння згарыць,
Ці з сынам любімым ракета.

Гэта з «Белых яблынь» Пімена Панчанкі. На перцы погляд можа нават здацца дзіўным: чаму высокую «зорную» тэму паэт выражае з дапамогай такога знаёмага нам, зямнога, вобраза? А менавіта якраз у гэтым глыбокі сэнс. Не бяздушнымі робатамі, а жывымі людзьмі прыляцім мы на іншыя планеты, і там спатрэбіцца і цвет яблыні, і ўсмешка каханай... Прачытаўшы верш, мы адчуваем, як па-новаму, як свежа і ўзнёсла прагучаў традыцыйны вобраз белых яблынь; яны тут не толькі ўвасабленне хараства нашай зямлі, але і сімвал усепераможнасці чалавека-творцы, яго мудрасці, яго розуму. Як бачым, спрачацца лірыкам з фізікамі няма з-за чаго: у іх адны парыванні, адно высокае імкненне — засяліць Сусвет вялікай людскою любоўю.

Гаворачы пра сілу грамадскага ўздзеяння мастацтва, часта абмяжоўваюцца яго эстэтычным, яго выхаваўчым значэннем. Забываюць, што сапраўдная паэзія — яшчэ і дзейсны памочнік навукі, магутны сродак пазнання свету. Гісторыя ведае нямала выпадкаў, калі ідэі, выказаныя мастацтвам, папярэднічалі вялікім навуковым адкрыццям. Круг, намаляваны на скале першабытным мастаком, наштурхнуў чалавека на думку зрабіць **кола**, з якім звязана цэлая рэвалюцыя ў развіцці вытворчых сродкаў грамадства...

Але вернемся да паэзіі нашых дзён. Вось радкі, якія нібыта і звернуты ў мінулае:

У юнацтве мы некалі перажылі
Развітанне з зямлёй і тугу па зямлі,
У сорак першым, далёкім і горкім,
На пераправах ішлі мы ка дну.
Марачы ўбачыць чырвоную зорку
Хоць бы адзіную, хоць бы адну
На крыле самалёта.
(П. Панчанка. «Размова з наследнікам»).

Пра што гэта? Пра вайну? Так. Але не толькі. Гэта і пра пакарэнне космасу! Нялёгкая наша дарога да зор. І пачалася яна не сёння. Паэт знаходзіць такую дэталь, якая, нібы святлом пражэктара, выхоплівае малюнак з грознага мінулага, — і мы, як сваіх паплечнікаў, як жывых удзельнікаў сённяшняга штурму космасу, адчуваем побач з сабой тых, хто застаўся на дымных пераправах вайны. І нават тое, што ў вершы абрываецца апошні радок, зусім не выпадкова: гэтым падкрэсліваецца драматызм паэтычнага малюнка. Хоць гэты верш звернуты ў мінулае, пра яго не скажаш, што ён гучыць не сучасна. Дзякуючы ўдумліваму зроку і чуйнаму да жыцця слыху мастака тут словы набылі тую стэрэафанічнасць, аб'ёмнасць гучання, якой адрозніваецца сапраўдная паэзія.

Гутарка ішла пра тэму касмічную, новую для паэзіі. А як жа з тым звычайным, зямным, што нас штодзённа займае і хвалюе?

Па-мойму, для аўтара, які ўмее не толькі рыфмаваць, але і думаць, не існуе дробязных тэм. Той ці іншы куток жыцця, які прыцягнуў яго ўвагу, прываблівае не толькі сам па сабе, а, галоўным чынам, у сувязі з тым, якія пачуцці, які роздум ён выклікаў, што дзякуючы яму паэт змог сказаць пра час і пра сябе.

Колькі раз апеты паэтамі росныя травы, мурожныя лугі. Але вось перад намі верш М. Танка «Дарога з сенажаці». І напісаны ён як быццам звычайна, проста: няма ў ім нечаканых рыфмаў, ашаламляльных модных метафар. «Дзень даўно павесіў на сасне касу зары», «Лесавік падпальвае карчы», спрачаюцца салаўі з «камарынай талакою звонкай» — такімі мяккімі лірычнымі мазкамі ствараецца вячэрні пейзаж, убачаны вачыма працаўніка, улюбёнага ў родныя краявіды... Але чытаем далей:

Пахнуць пераспелыя суніцы.
Чую подых кожнага лістка.
Чую, як дужмяная ігліца
Ападае з голляў сасняка.

Чую, як міжзорныя ракеты
Пралятаюць недзе нада мной...
Можа, мы — апошнія паэты,
Што вось так цікавяцца зямлёй?

І гэтая апошняя страфа, якая ўзнікае так нечакана і разам з тым так натуральна, як бы новым святлом пранізвае ўвесь верш: у ім мы пазнаём чалавека дапытлівай думкі, нашага сучасніка з яго зямной заклапочанасцю і зорнай акрыленасцю. Не выклікае пярэчання і тое, што паэт свой слых так проста пераключае ад «сасновай ігліцы» да «міжзорных ракет», іх суседства ў вершы ўспрымаецца, як зусім зразумелае. Такая музыка веку. Гэта не аднатонная частушка, а шматпланавая сімфонія. Мастак павінен чуць яе і даносіць да іншых.

Збліжаць далёкае, знаходзіць сувязі ў супрацьлеглым, адкрываць з'явы жыцця ў іх суадносінах з маштабамі часу, — ці не ў гэтым адна з галоўных задач паэзіі?

Новым спектаклем «Том—вялікае сэрца» па п'есе С. Багамазава і С. Шатрова, якая расказвае пра барацьбу каланіяльных народаў за сваё вызваленне, пачаў свой восьмы тэатральны сезон Беларускі рэспубліканскі тэатр юнага гледача. Пастаноўку п'есы ажыццявіў рэжысёр В. Пацехін, дэкарацыі да спектакля зрабіў студэнт-дыпломнік Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута Ю. Тур.

У спектаклі заняты артысты Ул. Говар-Бандарэнка, К. Мізгайла, М. Пятроў, Л. Міхайлаў, В. Піскун, В. Окалаў, Г. Ручынскі, Ю. Фляйто, А. Мацюкевіч і іншыя.

На здымку: сцэна са спектакля. У ролях: Лёшы — артыст М. Пятроў, Галінкі — артыстка К. Мізгайла.

Фота Ул. КРУКА.

Даты, назвы, імёны, каментарыі...

Барыс БУР'ЯН

Сярод кніг

ЦІ ВЕДАЕЦЕ вы, што ў 1927 годзе ў Ленінградзе будынак, дзе раней даваў свае паказы некалі вядомы тэатр «Крывое люстэрка», капітальна адрамантавалі для таго, каб там пачала сваю дзейнасць першая ў гісторыі беларускай культуры кінастудыя «Белдзяржкіно»? Што ў пачатку сваёй бліскучай творчай кар'еры нашы выдатныя артысты Ул. Крыловіч, Б. Платонаў, В. Пола і П. Малчанаў ужо здымаліся ў кіно, і асобныя кадры цяпер яшчэ захавалі іх непаўторна маладыя натхнёныя твары? Што акцёру, які выступаў у ролі першага сапраўднага героя ў першым мастацкім беларускім фільме, — Леаніду Даніламу даводзілася самому, без дублёраў, выскокваць праз акно з вышыні чацвёртага паверха, а брызент, які «страхаваў» яго, раптам прадраўся, і «Грышка-свінапас» быў выратаваны толькі таму, што зваліўся на бярэма сена?

Калі гартаеш кнігу «Беларускае кіно», сам даведваешся шмат чаго раней табе невядомага. Нават самым заўзятым аматарам кіно, напэўна, будзе цікава чытаць гэты кароткі нарыс. Яго аўтары А. Красінскі, В. Смаль і Г. Тарасевіч паставілі перад сабою складаную і высакародную задачу—сабраць і сістэматызаваць вялікі матэрыял па гісторыі маладой беларускай кінематаграфіі. Яны зрабілі гэта ўдумліва і добрасумленна. Ад іх увагі не выслізнулі нават самыя «маленькія» дакументальныя фільмы, што здымаліся ў дваццатых гадах.

Нарыс не з'яўляецца пералікам суцэльных удач і перамог. Аўтары не паляпшаюць і не грымяруюць мінулае, а стараюцца даваць прынцыповыя ацэнкі і таму, што было добра, і таму, што часам перашкаджала станаўленню ў Беларусі складанага і патрэбнага народу мастацтва.

Чытач, напэўна, заўважыць, як гэта не проста было пачаць беларускую кінематаграфію са здымкаў хранікальных кадраў святкавання Першамая ў Мінску ў 1925 годзе і потым перайсці да стварэння такіх яркіх для свайго часу фільмаў, як «Лясная быль», «Кастусь Каліноўскі», «Першы ўзвод», «Шлях караблёў», «Шукальнікі шчасця», «Балтыйцы». І, нарэшце, узняцца да вышынь вялікага кінематаграфічнага майстэрства, якім па-сапраўднаму адзначаны буйныя заваёвы савецкага экрана — «Канстанцін Заслонаў», «Гадзіннік спыніўся апоўначы» і «Чырвонае лісце». Перад намі — старонкі жыцця і напружаных творчых пошукаў атрады кінематаграфістаў.

Праўда, такое апавяданне хутчэй за ўсё складваецца ва ўяўленні чытача. Змест кнігі пераважна абмяжоўваецца паведамленнем тых ці іншых фактаў і вельмі сціплымі, нават сухімі па манеры пісьма каментарыямі. Нарыс пісаўся трыма аўтарамі. А чытаеш кнігу і здаецца, нібы ад першага да апошняга радка словы выводзіла адно пяро. Магчыма, гэта і добра з пункту гледжання ведамства —Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР, які выпусціў у свет кнігу «Беларускае кіно». Аднак аб'ект даследавання ў дадзеным выпадку быў да таго жывы і хвалюючы, што ад падобнай абыякавасці варта было б адмовіцца. Тым больш, што выступленні ў перыядычным друку, напрыклад, В. Смаля якраз і вызначаюцца зацікаўленым стаўленнем да тых ці іншых з'яў кінематографа. Чамусьці ў кнізе індывідуальнасці трох аўтараў страчаны, нібы кожны з іх толькі і клапаціўся, каб «ісці ў нагу» з двума іншымі, быць гранічна аб'ектыўным і ў сутнасці і ў стылі.

І тут хочацца сказаць некалькі слоў наогул пра акадэмічныя выданні. Чаму яны выходзяць нейкімі прыгладжанымі? Цяжка паверыць, але гэта так: на працягу 200 старонак кнігі мы не сустрэлі ніводнага намёку на асабістае хваляванне хоць бы таго аўтара, які, збіраючы матэрыял для нарыса, зноў праглядаў, напрыклад, таго ж «Кастуся Каліноўскага» ці перачытваў сцэнарый «Балтыйцы». Няўжо, праслухаўшы музыку Сяргея Пракоф'ева, да фільма «Паручык Кіжэ», даследчык не адчуў неабходнасці сказаць, няхай бы вельмі коратка, што-небудзь пра творчасць гэтага выдатнага кампазітара і яго значэнне для кінематографа?

Рэжысёр Ул. Корш-Саблін настойліва працуе ў гераічным жанры. У яго творчасці былі і прыкметныя ўдачы, і творчыя недахопы, якія, аднак, не прымусілі майстра адмовіцца ад таго, чаму ён верны з юнацкіх год. Відаць, гэта — жыццёвая неабходнасць і прынцыповая пазіцыя мастака. Вельмі цікава даведацца, як склаўся менавіта такі характар майстра кіно. А ў кнізе, нібы ў кішэнным энцыклапедычным слоўнічку, мімаходзь зазначана: «...служыў у Чырвонай Арміі і прайшоў вялікі шлях ад радавога да памочніка камандзіра палка». Падумаць толькі, стваральнік «Першага ўзвода» і «Канстанціна Заслонава» юнаком у грамадзянскую вайну мог быць памочнікам Аркадзя Гайдара! Хіба даравальна, што літаратар, асабліва калі ён папулярызуе творчасць вядомых мастакоў такога масавага віду мастацтва, як кіно, не выкарыстоўвае матэрыялы горача і падрабязна пагаварыць пра пакаленне адважных барацьбітоў за Савецкую ўладу, якія змянілі вінтоўку на пяро і на кіназдымачную камеру.

Я сказаў: «літаратар, які папулярызуе...» На жаль А. Красінскі, В. Смаль і Г. Тарасевіч наўрад ці збіраліся быць такімі. Яны абмежавалі сваю задачу, звузілі поле мастацтвазнаўчага даследавання, імкнучыся ажыццявіць тое, што абяцана чытачу ў выдавецкай анатацыі, дзе кніга «Беларускае кіно» называецца «пакуль першай спробай даць кароткі нарыс аб шляхах развіцця і асноўных творчых этапах беларускага кінамастацтва». Дзякуй аўтарам за тое, што гэтая — першая!—спроба ім удалася. Мы цяпер маем падрабязны і багаты фактамі даведнік. А вось нарыс атрымаўся даволі шэры. Ён інфармуе чытача і дае, як кажуць, матэрыял для роздуму. Самі аўтары паглыбляюцца ў роздум над той ці іншай праблемай даволі рэдка.

Вось прыклад. З усяго, што паведамляюць аўтары пра пасляваеннае беларускае кінамастацтва, узнікае надзённая і творча складаная праблема літаратурнага сцэнарыя як першакрыніцы фільма. У кнізе не замоўчваецца той агульнавядомы факт, што не адзін і не два, а многія творы «Беларусьфільма» — «Новы дом», «Палеская легенда», «Зялёныя агні», «Каханнем трэба дарожыць», «Пасеялі дзяўчаты лён», «Строгая жанчына», «Веснавыя навальніцы» і інш. — бывалі не толькі няўдачамі, а іншы раз і проста ганьбілі марку студыі. Галоўным чынам з-за дрэнных сцэнарыяў. Чаму б не спыніцца і не пагаварыць пра літаратурныя вартасці сцэнарыяў, якія ўсё ж «прабівалі» сабе шлях да экрана. Гэта было б карысна і для работнікаў кінематаграфіі і павучальна для шматлікіх аматараў кіно. Апошнія, шчыра кажучы, не заўсёды ўмеюць распазнаваць, хто вінаўнік поспеху ці правалу карціны, і нярэдка «прымаюць» ці «адвяргаюць» фільм, не лічачыся з тым, што было ў сцэнарыі. Калі тэатральны гледач амаль заўсёды параўноўвае, як на сцэне выглядае твор драматурга, дык у кіно такое бывае вельмі рэдка. Кнігі ж накшталт «Беларускага кіно» і павінны, апроч усяго іншага, вучыць гледача выносіць правільны прысуд таму, што паказана на экране.

Аўтары надзвычай прыблізна і спрошчана гавораць пра сапраўдныя, а не ўяўныя прычыны няўдач сцэнарыстаў. Нават іншы раз блытана. Вось сцэнарыст і рэжысёр М. Фігуроўскі, пра якога сказана, што «кожны яго твор... сведчыць аб тым, што Фігуроўскі настойліва працягвае пошукі новых шляхоў у раскрыцці тэмы гераічнага ў жыцці народа», напісаў і паставіў няўдалы сцэнарый «Веснавыя навальніцы». Дзе і ў чым прычыны гэтага? На старонцы 158 чытаем, што ён «...сур'ёзную і цікавую задуму... імкнуўся вырашыць некалькі абстрактна, пры дапамозе выпадковых з'яў. М. Фігуроўскаму яўна не хапіла дакладнасці жыццёвых назіранняў». Па-першае, цяжка зразумець, што мелі на ўвазе аўтары, калі сцэнарджалі, быццам ідэйна-мастацкія праблемы можна вырашыць «абстрактна» і адначасова «пры дапамозе выпадковых з'яў». Магчыма, выпадковымі трэба лічыць жыццёвыя дробязі, празмернае захапленне вонкава праўдападобнымі дэталямі. Але пры чым жа тут «абстрактна»? І ўвогуле атрымалася, што М. Фігуроўскі зусім не ў кожным творы шукае новыя шляхі «ў раскрыцці тэмы гераічнага». Справядлівым было б і такое меркаванне: магчыма, «Веснавыя навальніцы» — гэта нешта важнае на шляху пошукаў. Хай сабе, памылковае, здробненае, але творчае.

Аўтары не ўзгаднілі розныя характарыстыкі, якія яны далі аднаму і таму ж мастаку на розных старонках кнігі.

Прыблізна таксама, як і М. Фігуроўскі, у кнізе ахарактарызаваны сцэнарыст А. Маўзон. За «Зялёныя агні» яго крытыкуюць, а за «Канстанціна Заслонава» ставяць адзнаку «5». Зноў хочацца спытаць аўтараў: а можа і «Зялёныя агні» сведчаць аб нейкіх творчых пошуках А. Маўзона, якія, хай сабе, і не атрымалі вартага мастацкага ўвасаблення ў фільме?.. Навошта ж даваць магчымасць чытачу прыходзіць да такіх высноў. І ўсё гэта таму, што даследчыкі парушаюць логіку сваіх разважанняў, аддаюць перавагу факту, а не сістэме фактаў.

Мне могуць сказаць, што гэта прыдзіркі. Не, нашы заўвагі выкліканы жаданнем бачыць на кніжных паліцах разнастайную цікавую літаратуру аб нашым кінематографе. Цяпер, калі побач з дзесятай музай мастацтва— кіно, заняла ганаровае месца ў дамах соцень тысяч гледачоў адзінаццатая муза — тэлебачанне, такая літаратура выхоўвае людзей, вучыць іх адрозніваць добрае ад дрэннага, арыентавацца ў складаных пытаннях творчасці. Заслугоўвае пахвалы тое, што рупліва і любоўна прарабілі А. Красінскі, В. Смаль і Г. Тарасевіч.

Чытач умее чытаць кнігі. Таму не трэба зводзіць папулярызатарскую навуковую працу да спрошчанага пералічэння дат, назваў і прозвішчаў з дадаткам павярхоўных каментарыяў. Неабходна глыбей раскрываць сутнасць творчых пошукаў і знаходак, якімі ўжо багата беларускае кіно і якіх, спадзяёмся, будзе яшчэ больш. «Першая спроба» ў даследчай літаратуры, у асноўным, прайшла паспяхова для дэбютантаў у галіне кіназнаўства А. Красінскага, В. Смаля і Г. Тарасевіча. Настае час замацоўваць гэты частковы поспех больш удумлівымі і творчымі распрацоўкамі сур'ёзных праблем развіцця нашай кінематаграфіі.

Па рухах юных балерын нельга не пазнаць танец маленькіх лебедзяў з балета П. Чайкоўскага «Лебядзінае возера». Яго выконваюць выхаванкі Мінскага харэаграфічнага вучылішча Святлана Жандарова, Зоя Дарашкевіч, Кама Дубчанка і Каця Гарабец.

Фота Ул. КРУКА.

У ПОШУКАХ САМАБЫТНАСЦІ

Б. ВІШКАРОЎ

Абласныя драматычныя тэатры нашай рэспублікі час ад часу паказваюць свае спектаклі на сталічнай сцэне. Мінчане не маюць магчымасці штогод бачыць работы гэтых мастацкіх калектываў: права на творчыя справаздачы падлягае нейкай чарговасці. І бывае, што мы па некалькі год не сустракаемся з тым ці іншым тэатрам. Дарэчы, і час для гастролей абласных акцёрскіх труп у Мінску выпадае цяжкі: летнія месяцы, калі адсутнічаюць творчыя калектывы нашай сталіцы, з якімі гасцям хацелася б устанавіць патрэбныя кантакты.

Сёлета ў Мінску выступаў з творчай справаздачай Брэсцкі абласны драматычны тэатр імя ЛКСМБ. Ён паказаў некалькі новых спектакляў, у прыватнасці, два па п'есах беларускіх драматургаў. У час гастролей на мінскай сцэне брэстчане выпусцілі таксама новую прэм'еру «Сабака на сене». Вось аб некаторых пастаноўках нашых гасцей і хочацца пагаварыць, падагуліць свае ўражанні аб іх рабоце.

... Упершыню я пазнаёміўся з Брэсцкім тэатрам дзесяць год назад. Тады гэта быў маладзёжны калектыў. Значная частка трупы складалася з акцёраў, якія толькі пачыналі свой шлях у мастацтве, і больш сталыя артысты па свайму творчаму запалу мала чым адрозніваліся ад моладзі.

Калі сядзіш у зале і глядзіш спектакль, заўсёды можна беспамылкова сказаць, у якой абстаноўцы ён ствараўся: ці гэта плён намаганняў асобных акцёраў, ці вынік працы ўсяго мастацкага калектыву, дзе кожны выканаўца з адноўказай адказнасцю аддае ўсяго сябе любімай справе. Спектаклі, народжаныя ў атмасферы давер'я і дружбы, ніколі не пакідаюць гледача абыякавым, недахоп майстэрства ў іх дапаўняецца сардэчнай цеплынёй і ўсхваляванасцю акцёрскага калектыву. Усё гэта адчувалася ў ранейшых спектаклях брэстчан. А калі яшчэ дадаць, што сярод творчай моладзі было многа людзей таленавітых, і што ўвогуле трупа вызначалася вялікай разнастайнасцю акцёрскіх індывідуальнасцей, дык стане зразумелым яе поспех у гледачоў.

З гадамі маладыя акцёры перайшлі ў сярэдняе пакаленне, іх майстэрства ўзмацнела. Некаторыя з іх пайшлі працаваць у іншыя тэатральныя калектывы. З тых жа, хто застаўся, складаецца зараз ядро Брэсцкага тэатра. Сёння можна гаварыць аб асобных яго акцёрскіх індывідуальнасцях, аналізаваць іх работу. Аднак паказаць, чым адрозніваецца брэсцкі калектыў ад тэатраў іншых гарадоў, у чым яго своеасаблівасць і непаўторныя рысы—вельмі складана.

У свой час Тэатр імя ЛКСМБ паставіў усхваляваную патрыятычную аповесць аб абаронцах Брэсцкай крэпасці, на яго сцэне ішлі п'есы «Юнацтва бацькоў», «Любоў Яравая», «Вей, ветрык», «Чайка», «Крамлёўскія куранты» і іншыя. У іх пазнаму, але глыбока і сур'ёзна вырашаліся пытанні фарміравання характару маладога чалавека.

На маю думку, цяпер брэстчане ў многім уступілі свае ранейшыя творчыя пазіцыі, адышлі ад вырашэння тых задач, якія стаяць перад тэатрам.

Можа, такая думка ўзнікла таму, што быў выпадкова падабраны рэпертуар сёлетніх гастролей? Зусім не. Гэты рэпертуар складаўся з мэтай паказаць найбольш значныя спектаклі. Тады якія вялікія задачы вырашае, напрыклад, п'еса П. Васілеўскага «Дзіўны дом»? У ёй шмат надуманага, пазбаўленага жыццёвай логікі. Яе «вострыя праблемы» могуць уздзейнічаць толькі на нездаровыя абывацельскія інстынкты. І шкада, што цікавыя работы артыстаў Т. Заранок, А. Логінава, Б. Уксусава і іншых маюць такі малы каэфіцыент карыснага дзеяння.

У час гастролей брэстчане паказалі яшчэ адзін спектакль па п'есе беларускага драматурга — «Чалавек за бортам» Я. Пасава. Мэта, якую паставілі перад сабой аўтар, а затым і тэатр,—зразумелая і заслугоўвае адабрэння. У п'есе расказана аб лёсе дзяўчыны, якая трапіла ў павуцінне сектантаў, заблыталася ў ім, а потым вярнулася да свайго ранейшага жыцця. Спектакль у многім цікавы, ён хвалюе. Аднак у ім вельмі прыкметны недасканаласці драматургічнай асновы. Аўтар старанна і падрабязна распрацоўвае характары дзеючых асоб, крок за крокам паказвае, як і чаму Галя Паўлава (артыстка Р. Семічова) трапляе пад уплыў сектантаў.

Выдатна выкарыстоўваюць аўтарскі матэрыял артысты А. Асторына і А. Логінаў, якія іграюць сямейную пару Галіных «апекуноў»—сектантаў. Вельмі жыва і дружна праводзяць свае ролі моладзь спектакля— Галя і яе сябры (артысты Л. Зельцына, І. Пяскова, Г. Токараў, Р. Мірскі і Т. Цярохіна).

Але вось надыходзіць момант, калі трэба выручаць Галю з бяды, а ў аўтара засталося мала сцэнічнага часу, усе папярэднія «загатоўкі» ўжо нельга выкарыстаць і частка з іх аказваецца непатрэбнымі. Аўтар спяшаецца і на скорую руку расскае ўсе моцна завязаныя вузлы. Таму ад спектакля і застаецца двоістае ўражанне.

Варта падрабязна спыніцца на п'есе Фрыца Куна «Крэдыт у нібелунгаў», пастаўленай брэсцкім калектывам. Сюжэт п'есы дасціпны і арыгінальны, мае яркую палітычную афарбоўку. Дзеянне п'есы адбываецца ў нашы дні ў ФРГ. Зігфрыд Блок—былы франтавік, фотакарэспандэнт па спецыяльнасці, знясілены бесперспектыўнасцю свайго жыцця, адважваецца на грандыёзную афёру, якая абяцае прыбытак: ён выдумляе версію, што Гітлер жывы, знаходзіцца за граніцай і цяпер праз Зігфрыда Блока наладжвае сувязі са сваімі былымі прыхільнікамі.

Зігфрыд націскуў на вельмі важны рычаг у машыне рэваншыстаў: у дзеянне ўступаюць сілы, якія ў выніку знішчаюць самога аўтара праекта — Зігфрыда. Трагізм маленькага чалавека ў тым, што ён, вырашыўшы нават стаць злачынцам, не можа спаборнічаць з больш моцнымі канкурэнтамі, якімі з'яўляюцца вельмі салідныя дзеячы Заходняй Германіі. Бо, ўбачыўшы палітычную і матэрыяльную выгаду сітуацыі, яны адразу забіраюць справу ў свае рукі. Зразумела, сітуацыя п'есы гратэскавая, спружына сюжэта—неверагодны анекдот. Але ён дае аўтару вялікія магчымасці для раскрыцця вар'яцкай псіхалогіі рэваншыстаў, іх характараў.

У спектаклі, які пастаўлены рэжысёрам П. Вінаградавым, ёсць многа акцёрскіх удач.

Але дзіўная з'ява адбываецца ў спектаклі. У пачатку яго ўсе вобразы ўвасабляюцца ў плане зусім рэалістычнай п'есы. Але чым далей развіваецца дзеянне, тым больш выпустошваецца з кожнага вобраза яго псіхалагічная сутнасць і ён становіцца аднастайным, плакатным. Толькі артысты Б. Уксусаў (Зігфрыд Блок) і Є. Яўдошанка (Клейн) застаюцца на першапачатковых пазіцыях і праводзяць свае ролі ў адной манеры. Апошняя сцэна спектакля ўвогуле набывае рысы схематызму і пазбаўляецца ранейшай праўдападобнасці.

Некалькі слоў аб апошнім спектаклі, паказаным у Мінску, прэм'еры «Сабака на сене» Лопэ дэ Вега. Рэжысёр Ю. Арынянскі ажыццявіў пастаноўку з добрым густам, адышоўшы ад традыцыйнага «шумнага» вырашэння іспанскай п'есы. У спектаклі многа іроніі, усмешкі, добра распрацаваны адносіны паміж персанажамі. Удала, у высакародных танах зроблена вонкавае афармленне спектакля (мастак А. Петрачэнка). Заслугоўвае ўхвалы выкананне роляў артыстамі Н. Камінскай (Дыяна), Ю Уласавым (Тэадора), Г. Волкавым (Трыстан) і С. Яўдошанка (Рыкардо), хоць і ўсе астатнія выканаўцы стараюць адзіны ансамбль. Праўда, пры ўсім станоўчым уражанні ад спектакля, ад яго павявае некаторым халодным «акадэмізмам», неўласцівым класічнай камедыі.

Трэба сказаць, што мінулае Тэатра імя Ленінскага камсамола Беларусі (магчыма, трошкі ідэалізаванае аўтарам гэтых радкоў) і цяперашняе, да якога мы заўсёды ставімся больш патрабавальна, гавораць аб тым, што ў гэтым калектыве ёсць дастаткова творчых сіл, каб адстайваць свае права на самабытнасць, на свой шлях у беларускім мастацтве. Зразумела, усё залежыць перш-наперш ад рэпертуару. Трэба аднойчы рашуча адмовіцца ад тых п'ес, якія выконваюць забаўляльна-касавую функцыю, і заўсёды помніць аб высокім прызванні тэатра. У пачатку такой «рэформы» тэатр страціць нейкую частку гледачоў, але глыбокае і сур'ёзнае мастацтва абавязкова прыцягне потым у тэатр пастаянных яго прыхільнікаў.

Знаёмячыся з апошнімі здабыткамі нашай паэзіі, пераконваешся, што гэтае вострае адчуванне часу, імкненне асэнсаваць складанасць з'яў сучаснага жыцця ўсё больш напаўняе творчасць як сталых, так і маладых яе прадстаўнікоў.

Сучаснік зараз уваходзіць у верш, як у свой дом, а не дзеля таго, каб пазіраваць перад аб'ектывам, яго ўжо не задавальняе проста фатаграфія, няхай сабе нават і вельмі эфектная, — з кельмай у руцэ, у водсветах мартэнаўскай печы, за трактарным рулём... Рацыяналістычная зададзенасць, лозунгавая прасталінейнасць саступаюць месца засяроджанаму роздуму, паэтычнай асацыяцыі. Радуе, што менавіта ў гэтым напрамку вядзе свае творчыя пошукі паэтычная моладзь. Яна імкнецца да паэзіі, у якой прасторна думкам. Пра самыя велічныя падзеі часу сціслыя радкі гавораць больш, чым напышлівая рыторыка. Вось верш, які хочацца прывесці цалкам:

Малюнак звычайны.
Такім і пакіну яго на паперы:
Сад, антонаўкі з'ясі адну — на месяц аскоміна.
Дым з хаты ідзе не праз воны і дзверы.
А з коміна.
Цыбаты дожджык страху ліжа.
Хлопчык сцябае пугай свіней.
На сметніку певень рыжы
Канвіруе горда курэй...
Засумаваў я,
Пазіраючы на малюнак гэты,
Дзе дожджык, куры і грязь месцяцца...
І раптам навіна:
Наша ракета
Дабралася да Месяца!
Сына захацелася падкінуць вышэй весніцаў.
Рукі мае да малога цягнуліся самі.
Няўжо гэта я дакрануўся да Месяца
Сваімі рукамі?
(А. Наўроцкі).

З якой прачуласцю тут выказана думка аб тым, што героіка вырастае з нашай будзённасці, што ў нас кожны звычайны чалавек мае асабістае дачыненне да фантастычных здзяйсненняў веку!

Вобраз нашага часу — суровага і радаснага, будзённага і рамантычнага, пагодніга і навальнічнага, такога звычайнага і такога выключнага — усё больш уладна ўваходзіць у паэзію. Гэта вельмі прыкметна на творчасці, напрыклад, такога паэта, як Р. Барадулін. Раней ён, захапляючыся слоўным жывапісам і гукапісам, яркасцю метафар, не заўсёды дастаткова дбаў пра сэнсавае напаўненне вобраза, і таму верш часамі рассыпаўся на радкі, якія гучалі, як стрэлы ўхалястую. Зараз паэт усё настойлівей імкнецца сцэментаваць вобразную мазаіку думкай, стварыць цэласныя стройныя малюнкі, вытрыманыя на адным дыханні. Прачытайце хоць бы яго верш «Украіна», і вы пераканаецеся, як аўтар умее праз нязначныя, на першы погляд, дэталі побыту, вельмі тонка гаварыць пра тыя вялікія змены, якія не абыходзяць ніводзін куток нашага жыцця.

І мне здаецца зусім заканамерным, што ў некаторых маладых паэтаў назіраецца цяга да свабоднага, асацыятыўнага верша. Відаць, нашай складанай, шматграннай рэчаіснасці, з яе неспакойным, імклівым рытмам робіцца цесна ў рамках класічнай сілаба-тонікі.

І таму не варта спяшацца абвінавачваць у фармалізме ці ў якім-небудзь іншым «ізме» тых паэтаў, якія імкнуцца шукаць новыя сродкі мастацкай выяўленчасці.

Кажуць, што маладыя паэты тут не выступаюць першаадкрывальнікамі. І вольны белы верш, і каранёвыя рыфмы, і асацыятыўны вобраз—усё гэта, маўляў, было ўжо ў савецкай літаратуры, ды і зараз можна знайсці ў замежных паэтаў. Калі нават гэта было і так, дык няма падстаў для трывогі. Гутарка ж не пра механічнае капіраванне чужых паэтычных прыёмаў! Чаму, уласна, адмаўляцца ад здабыткаў у галіне формы, якія ўзбагачаюць мастацкую палітру, якія здольны паспяхова служыць нашаму часу, дапамагаюць паэтам паўней намаляваць яго вобраз?

Сустракаешся і з разважаннямі такога характару. Вольны верш? Асацыятыўны вобраз? Не прыжывуцца! Не ў традыцыі нашай паэзіі!..

Наўрад ці такія меркаванні можна лічыць сур'ёзным довадам: гісторыя паказвае, што след у ёй пакідалі тыя мастакі, якія, абапіраючыся на вопыт папярэднікаў, сцвярджалі свае, новыя эстэтычныя прынцыпы. Часамі лепшы працяг традыцыі—гэта спрэчка з ёю. Не вайна на знішчэнне, а творчая спрэчка. Трэба ўрэшце больш давяраць таленту саміх паэтаў: няхай слабарнічаюць добрыя і розныя.

Мяне асабіста непакоіць не тое, што паэты **шукаюць**, а тое, што вершатворцы **штампуюць**. Па-рамесніцку. Бяздушна. Што, напрыклад, могуць сказаць розуму ці сэрцу такія радкі:

Куды ні гляну —
Усё навокал міла.
І ў сэрцы
Разгараецца любоў...
(А. Дзеружынскі).

Дзіўна атрымліваецца. Вершы, падобныя да цытаваных, зараз ужо не кожная газета рызыкне змясціць у звычайным будзённым нумары. А вось да знамянальнай падзеі, да ўрачыстай даты — калі ласка! Хочацца запытацца: якога чытача можа ўзрадаваць такі святочны «падарунак»?

І хоць дэкларавание прапісных сцёртых ісцін, рыфмаванне рытарычных заклікаў, якім так доўга прысвойвалі імя публіцыстычнай лірыкі, зараз ужо мала хто блытае з паэзіяй, аднак інерцыя бяздумнасці яшчэ даволі моцная. І формы, у якіх яна выступае, трэба сказаць, даволі разнастайныя. Некаторыя з іх нагадаем чытачу. Гэта перш за ўсё інфармацыйнасць і фактаграфія. Як вядома, большасць паэтаў жывуць у сталіцы. Час ад часу яны выязджаюць у вёску, да бацькоў, да сваякоў. Не пра кожны такі візіт, разумеецца, паведамляюць газеты. Але не бяда: гэтае ўпушчэнне рэпарцёраў запаўняюць... самі паэты. Нібыта адгукаючыся на заклік Р. Барадуліна, які напамінае, што «трэба дома бываць часцей», справаздачы аб сваіх сустрэчах з землякамі-аднавяскоўцамі даюць Г. Кляўко і К. Цвірка:

Не заходзячы ў хату.
Ты ведаеш добра наперад.
Як цябе тут прывецяць
І шчыра запросяць к сталу, —

так выказвае свае радасныя прадчуванні перад спатканнем з бацькоўскім домам Кляўко. Развіваючы і канкрэтызуючы яго, Цвірка перадае свае эмоцыі ўжо ў часе самога частавання:

Мне б цяпер з братвою зноў
Выйсці ў шыр без меж,
Ну а тут бацькі адно:
Пі ды еш.

Можна было б і не спыняцца на гэтых «узорах». Але, на жаль, вершы-візіты даволі распаўсюджаны ў творчасці маладых. Маладыя аўтары вельмі ахвотна дзеляцца ўспамінамі пра «басаногае маленства», пра тое, як яны бегалі за курамі і пасвілі кароў... Калі такая інфармацыя і абуджае якія-небудзь эмоцыі, дык толькі ў саміх аўтараў, але не ў чытача.

Трывала прыняўся на паэтычнай ніве і іншы гатунак бяздумнасці. Гэта рацыяналістычная зададзенасць. Тут патрабуецца ўжо і думка пэўная. Не абавязкова свежая, арыгінальная... Выказваецца яна звычайна ў канцы верша:

Я рад
Што так суджана жыць,
Спакою не знаць ні хвіліны,
Хвіліны на месцы не быць!
(А. Ставер.).

Такі глыбакадумны вывад аўтару навеяла паездка ў цягніку, які, бегучы насустрач вятрам, «рассякае абшар»...

І яшчэ адна разнастайнасць бяздумнасці — уяўная мнагазначнасць. Гэта ўжо, так сказаць, заяўка на паэзію філасофскую. Разумеючы, што паэт павінен асэнсоўваць з'явы і факты, але не маючы што сказаць, аўтар пускаецца ў філасофскае разважанне пра першы ж прадмет, які трапіўся на вочы... Ну, скажам, хоць бы пра камень.

Чытачу паведамляецца шмат каштоўных звестак з гісторыі каменя—з ім «продкі хадзілі на добыч», яму «пакланяліся вякамі», яго святасць захоўвалі побач «з культам агню і вады»...

І вось, нарэшце, гэты камень «у падмурак кладуць муляры». На яго натуральна цісне цяжар сцен. Гэта паэт перадае вобразна:

Кажуць, чулі, як крэкча ён часам,
Але болей, спацелы, маўчыць.

Такое «бачанне» можа ўзнікнуць, бадай, толькі ў таго, хто валодае сапраўды нязвыклым уяўленнем... Але галоўнае, зноў жа такі, у значнасці выраду, які робіць аўтар верша І. Сіпакоў:

Бо пакладзен людскімі рукамі
Ён для працы людской, не для ўцех...
Вось такому працоўнаму камню
Пакланіцца нікому не грэх.

Недарэчнасць такой філасофскай нагрузкі верша настолькі відавочная, што яна можа выклікаць адно іранічную ўсмешку ды спачуванне марна патрачаным аўтарскім намаганням.

Толькі факты і з'явы, убачаныя ва ўсёй іх непаўторнай жыццёвай канкрэтнасці, здольны абудзіць сапраўдны паэтычны роздум. Шлях да мастацкага абагульнення ідзе праз эмацыянальнае асваенне прадмета. Даходлівасць і дзейснасць любога падтэксту, другога плана залежыць ад таго, наколькі жыццёва праўдзіва і мастацкі пераканальны сам тэкст, першы план. Забываючы гэта, мастак рызыкуе ператварыць свой вобраз у штучны сімвал, умоўны знак для абазначэння ідэі. Мастацтва не можа абысціся як без глыбокага жыццёвага зазямлення, так і без чуйнай паэтычнай антэны. Толькі спалучэнне таго і другога памагае паэту настроіцца і працаваць на неспакойных хвалях эпохі.

ВА ЎСЕ КАНЦЫ СВЕТУ

«Гэты нумар прысвечаны літаратуры і мастацтву Беларускай рэспублікі». Такія словы на вокладцы восьмай кніжкі часопіса «Савецкая літаратура», які выдаецца ў Маскве на англійскай, нямецкай, польскай і іспанскай мовах. Часопіс мае на мэце знаёміць зарубежных чытачоў з сучаснай многанацыянальнай савецкай літаратурай, папулярызаваць за мяжой яе лепшыя здабыткі.

Як адзначаецца ў рэдакцыйным артыкуле, якім адкрываецца восьмая кніжка «Савецкай літаратуры», нельга ў адным нумары часопіса поўна прадставіць багацце і разнастайнасць сучаснай беларускай літаратуры, але рэдакцыя кіравалася тым, каб даць чытачу ўяўленне аб творчасці найбольшага кола пісьменнікаў, добрых і розных. У адпаведнасці з гэтым падабраны кароткія апавяданні і ўрыўкі з твораў празаікаў, паэты прадстаўлены адным-трыма вершамі. Зарубежны чытач пазнаёміцца з апавяданнямі Я. Брыля, М. Лынькова, І. Шамякіна, урыўкамі з твораў І. Мележа, В. Быкава, А. Адамовіча і А. Макаёнка. Тут жа даюцца кароткія нататкі аб жыцці і творчасці гэтых аўтараў. Публікуюцца вершы П. Броўкі, М. Танка, А. Куляшова, П. Глебкі, П. Панчанкі, А. Русецкага, А. Вялюгіна і Р. Барадуліна.

Кароткі агляд развіцця беларускай літаратуры ад старажытнасці да нашых дзён даецца ў артыкуле Д. Бугаёва. Ю. Кенэ расказвае аб сучаснай прозе, М. Гарбачоў — аб гродзенскіх літаратарах, Н. Гілевіч — аб маладой паэзіі.

Гэты расказ аб беларускай літаратуры працягваецца і ў раздзеле «Форум пісьменнікаў і мастакоў». Тут змешчаны інтэрв'ю з Ул. Дубоўкам, нататкі аб сваёй пісьменніцкай рабоце П. Пестрака і Ул. Карпава.

Беларускае мастацтва прадстаўлена ў часопісе двума артыкуламі і некалькімі рэпрадукцыямі твораў нашых мастакоў і скульптараў. С. Нісневіч расказвае аб сімфоніях маладых кампазітараў Р. Бутвілоўскага, Д. Смольскага і Ул. Чараднічэнкі. Творчасці вядомага беларускага артыста Б. Платонава прысвечаны артыкул Г. Коласа. Зарубежны чытач пазнаёміцца па рэпрадукцыях з творамі З. Азгура, В. Жолтак, А. Паслядовіч, А. Гугеля, Ю. Тышкевіча, А. Лось і Г. Якубені.

Т. Хадкевіч у сваім нарысе расказвае аб мінулым і сучасным роднай Беларусі, аб вялікіх поспехах беларускага народа ў развіцці эканомікі і культуры рэспублікі.

Заканчваецца часопіс нататкай Я. Садоўскага аб кнігавыдавецтве і перакладчыцкай справе ў Беларусі.

Несумненна, што часопіс знойдзе шмат чытачоў за межамі нашай Радзімы. Ва ўсе канцы свету ён панясе голас Савецкай Беларусі.

ГОСЦІ СТАЛІЦЫ

Колькі людзей прыязджае за суткі ў Мінск? Устанавіць гэта, відаць, цяжка. Затое дакладна ведома, што кожны дзень у сярэднім у сталіцы бывае 250 экскурсантаў.

Мы бачым іх усюды — на плошчах і ў парках, у музеях і ля тэатральных кас.

Што прапануе гасцям сталіцы гарадское экскурсійнае бюро?

Экскурсіі вядуцца па маршрутах: «Мінск у мінулым, цяперашнім і будучым», «Гісторыка-рэвалюцыйныя месцы Мінска», «Па месцах камуністычнага і камсамольскага падполля», «Вялікі пясняр беларускага народа Янка Купала», «Мастацкі музей БССР», «Беларускі музей Вялікай Айчыннай вайны». Госці наведваюць такія буйныя прадпрыемствы сталіцы, як трактарны завод, мотавелазавод, падшыпнікавы, фарфорафаянсавы, гадзіннікавы заводы, друкарню выдавецтва «Звязда», камвольны і тонкасуконны камбінаты, кандытарскую фабрыку «Камунарка» і інш. Экскурсанты выязджаюць і за горад: на месцы баёў і партызанскіх стаянак перыяду Вялікай Айчыннай вайны, на Мінскае мора, на Брэзэіну, дзе рускія войскі грамілі захопніцкую армію Напалеона...

Што думаюць госці аб нашай сталіцы, якія ўражанні застаюцца ў іх ад наведання прадпрыемстваў?

Вось кароткія запісы на экскурсійных пуцёўках:

«Мы ўсе, як адзін, зачараваны прыгажосцю і чысцінёй горада Мінска. Малайцы, мінчане! Экскурсанты Масноўскага навукова-тэхнічнага таварыства».

«Мы, турысты Стаўрополля, у захапленні ад таго, што жыхары Мінска так цудоўна адбудавалі свой горад. Жадаем мінчанам далейшых поспехаў!»

«Турысты поезда Харкаў—Масква выказваюць сваё захапленне сталіцай братняй Беларусі».

«Слухаючы расказ экскурсавода, здзіўляліся гераізму і мужнасці нашых савецкіх людзей, якія аддавалі сваё жыццё за вызваленне роднага народа. Нам, настаўнікам, экскурсія дала багаты матэрыял для выхаваўчай работы сярод вучняў».

«Студэнты Запарожскага машынабудаўнічага інстытута, наведаўшы аўтазавод, убачылі шмат добрага, новага, неабходнага для будучых інжынераў».

Людзі імкнуцца выказаць свае ўражанні. Не бяда, што пуцёўку — фінансавы дакумент падшываюць у бухгалтэрыі. Экскурсант, вярнуўшыся, раскажа аб убачаным сябрам, таварышам па рабоце, знаёмым. З кожным годам расце колькасць людзей, якія жадаюць наведаць Мінск.

— У параўнанні з мінулым годам, — сказаў нам дырэктар Мінскага экскурсійнага бюро П. Катцоў, — мы абслужылі на 700 экскурсій больш. Агульная колькасць экскурсій за 6 месяцаў дасягнула лічбы 2.635, агульная колькасць экскурсантаў—45 тысяч. Спатрэбілася б цэлая армія штатных работнікаў, каб абслужыць гэты паток прыязджаючых, а ў бюро ўсяго тры чалавекі. Таму ўсю сваю работу мы пабудавалі з разлікам на актыў. Для правядзення экскурсій падабрана каля двух дзесяткаў вопытных экскурсаводаў — работнікаў музеяў, старажылаў горада, непасрэдных удзельнікаў гістарычных падзей. Па месцах баёў і партызанскіх стаянак часоў Вялікай Айчыннай вайны гасцей сталіцы суправаджае, напрыклад, былы партызанскі камандзір Пётр Лавецкі, аб гістарычных месцах горада Мінска расказвае вопытны музейны работнік Вольга Верамейчык.

Ёсць у нас свае штатныя экскурсаводы на ўсіх буйнейшых прадпрыемствах сталіцы. Гэта інжынерна-тэхнічныя работнікі, перадавікі вытворчасці. Для экскурсаводаў рэгулярна наладжваюцца семінарскія занятні. Яны забяспечаны літаратурай, спецыяльнымі буклетамі, фатаграфіямі.

— А ці ўсё добра з абслугоўваннем гасцей?

— Не, далёка не ўсё. Многія, асабліва «неарганізаваныя», экскурсанты застаюцца за сферай нашага ўплыву. Па прыкладу масквічоў мы плануем цяпер пачаць абслугоўванне транзітных пасажыраў. Экскурсіі па гораду будуць наладжаны для тых, хто бывае ў сталіцы праездам і вымушаны пэўны час знаходзіцца на вакзале, у аэрапорце, на аўтобуснай станцыі. Будуць адкрыты пункты запісу экскурсантаў у гасцініцах.

Мы даўно чакаем выдання кнігі пра Мінск. Няма ў нас ні апісанняў маршрутаў экскурсій па памятных месцах, ні нават простай брашуры аб тым, як праехаць па сталіцы. Госці пытаюцца памятных паштовак, сувеніраў, значкоў, але іх у продажы амаль няма, а тыя, што ёсць, не задавальняюць экскурсантаў.

З кожным годам нашу сталіцу наведвае ўсё больш экскурсантаў. З кожным годам павінны павялічвацца клопаты аб іх.

М. БАРЫСАЎ.

Беларускі эстамп у Кіеве

У Кіеве адкрылася Усесаюзная выстаўка эстампа. Адкрываючы яе ад імя Саюза мастакоў СССР, вядомы графікі краіны Піменаў і Касьян адзначалі хуткае развіццё гэтага віда мастацтва на Украіне і ў Беларусі.

Яшчэ два гады назад на першай такой выстаўцы ў Ленінградзе ад БССР удзельнічалі толькі тры мастакі: І. Гембіцкі, С. Герус і А. Тычына, а ў цяперашняй экспазіцыі наша рэспубліка прадстаўлена дзесяццю аўтарамі, якія выставілі 15 лепшых сваіх работ у тэхніцы лінагравюры, літаграфіі і афорта.

Разнастайныя творы беларусаў і ў жанрава-тэматычных адносінах. Старэйшы майстар беларускага афорта Л. Ран стварыў глыбока псіхалагічны партрэт калгасніка. Яго захапленне партрэтам сучасніка мае ўжо сваю гісторыю: Л. Ран пачаў працаваць у партрэтным жанры яшчэ ў гады вайны пастэлю. Цяпер ён дасягнуў лаканізму і лёгкасці ў тэхніцы афорта.

Чалавечнасцю і цеплынёй адзначан партрэт шахцёра, створаны А. Паслядовіч.

Аўтар многіх тэматычных лінагравюр С. Герус прадставіў дзве работы ў гэтым жанры — «На сенакосе» і «Будаўнікі Салігорска». Ён умела выкарыстоўвае дэталь, выражаную смелым, дакладным штрыхам. Прыцягвае ўвагу кампазіцыйны стыль і каларыстычныя асаблівасці работ таленавітага беларускага мастака А. Кашкурэвіча. Яго дзве літаграфіі з серыі «Аэрадром» цікавыя і графічным вырашэннем і светаадчуваннем.

Прырода роднай рэспублікі жыве яркім жыццём у каляровай лінагравюры «Сакавік» Г. Лойкі. Сіні снег на цёмным фоне лесу і конік, што бяжыць дробнай рысцю па зляжалым снезе, пад звісаючымі правадамі электраперадач — складаюць змест гэтага твора. Пляма ценяў на снезе добра спалучаецца з плямай цёмнага лесу і ўвесь каларыт пейзажа надае яму эмацыянальнасць. Цікавы і пейзаж маладога графіка Я. Ціхановіча «Лагойскі раён» сваім кампазіцыйным вырашэннем. Вельмі своеасаблівыя ілюстрацыі да беларускай народнай казкі «Залатая яблынька», якія прадставілі на выстаўцы кніжныя графікі А. Лось і Г. Якубеня.

Радасная з'ява цяперашняй выстаўкі — удзел у ёй таленавітай моладзі. Выпускнік тэатральна-мастацкага інстытута Г. Паплаўскі і выпускнік мастацкага вучылішча Кузняцоў прадстаўлены тут добрымі лінагравюрамі.

Выстаўка працягнецца да 25 верасня і пасля абмеркавання ў выставачнай зале Украіны лепшыя работы будуць экспанавацца ў Маскве, на выстаўцы ў Доме дружбы народаў.

М. СМІРНОЎ.

На здымку: сцэна з балета «Жызель» у выкананні К. Максімавай і М. Ліепы.

Фота А. ВАРАТЫНСКАГА.

З ГЛЫБІНІ СТАГОДДЗЯЎ

Аўтамабільная магістраль Мінск—Масква каля Талачына перасякаецца пакручастай рэчкай Друць. Калі ад гэтага месца адправіцца на поўдзень, уніз за плынню Друці, то прыблізна на трыццатым кіламетры можна ўгледзець нечаканую карціну. На правым высокім беразе велізарны земляны вал, які ўтварае даволі правільнай формы замкнёнае кола. Знадворку вала — глыбокі роў. Усё гаворыць аб тым, што гэты вал насыпаны. І сапраўды, тут, пад абаронай затопленага вадой рова і крутых сцен, некалі жылі людзі. Больш таго — паселенне гэтае было горадам, братамблізнюком Мінска і Віцебска. Па назве рэчкі горад меў назву Друцка. Першае летапіснае ўпамінанне аб ім адносіцца да 1092 года.

Гісторыя Друцка поўная драматычных старонак. Ён адыгрываў вялікую ролю ў міжусобных княжацкіх войнах. На яго вулічках, пакрытых драўляным насцілам, часта ўзнікалі пажары. Тут трагічна складваўся лёс многіх людзей: Друцк доўгі час быў месцам ажыўленага нявольніцкага гандлю. Урэшце рэшт, гораду выпаў самы сумны лёс. Ён быў дашчэнту разрабаваны чарговым варожым набегам. Тыя з жыхароў, хто застаўся ў жывых, праклялі гэтае месца, і больш ужо ніхто тут не сяліўся.

Мінулі стагоддзі. Снягі, дажджы, ветры і сонца зрабілі сваю справу. Апошнія сляды Друцка аказаліся занесенымі, параслі травою. За межамі калісьці грознага вала ўзнікла невялікая вёска, якая стаіць і па сённяшні дзень, а на месцы горада так і засталася пустэча.

Гэты своеасаблівы беларускі варыянт «гібелі Пампеі» пастаянна выклікаў цікавасць гісторыкаў. Рабіліся асобныя спробы археалагічных раскопак. Вельмі абмежаваныя па аб'ёму работ, яны прыносілі бедны матэрыял. І толькі цяпер, з арганізацыяй Полацка-Прыбалтыйскага атрада Інстытута археалогіі Акадэміі навук СССР, над векавымі таямніцамі гісторыі Друцка заслона пачала прыўзнімацца.

Раскопкамі выяўлена дакладнае размяшчэнне старажытнага горада. Вось месца княжацкага двара, на якім у адрозненне ад іншых участкаў знаходзяць найбольш каштоўныя рэчы... Вось кварталы рамеснікаў. Друцк, аказваецца, быў вядомы не толькі ваяўнічымі князямі, але і працавітымі, вельмі добрымі майстрамі касцяной разьбы, чаканшчыкамі, гарбарамі... У цэнтры горада — плошча княжацкай дружыны... Паўночна-ўсходняя ўскраіна захоўвае памяць аб апошніх абаронцах Друцка, якія самааддана змагаліся з ворагам, што асадзіў горад, чыя сіла, відаць, у шмат разоў перавышала сілы гараджан. Тут, у самых верхніх пластах старадаўніх глебавых напластаванняў, выяўлена брацкая магіла княжацкіх воінаў...

Начальнік Полацка-Прыбалтыйскага атрада, кандыдат гістарычных навук Леанід Васільевіч Аляксееў і адзін з яго шматлікіх памочнікаў, мясцовы школьнік Міша Валентаў за работай.



Агульны выгляд раскопак на месцы квартала рамеснікаў. У цэнтры выразна відаць рэшткі жылога дома, а злева ад яго—драўляны насціл.

Цяпер яшчэ рана падводзіць вынікі работы атрада. Аднак бясспрэчна, што дэталёвае вывучэнне матэрыялаў раскопак і намечаны на будучыя гады працяг даследаванняў значна папоўняць новымі каштоўнымі падрабязнасцямі старонкі мінулага Беларусі.

Тэкст і фота **А. ДЗІТЛАВА.**

Гастролі Ленінградскага тэатра

Паказам аперэты «Роз-Марыі» Ленінградскі ансамбль аперэты пачаў свае гастролі ў Гомельскім Палацы культуры чыгуначнікаў імя Ул. І. Леніна. Ленінградскія артысты і музыканты прабудуць тут два тыдні і за гэты час пакажуць гамяльчанам аперэты «Вяселле ў Малінаўцы», «Марскі вузел», «Нітуш», музычную камедыю «Аднойчы белай ноччу...» і іншыя творы.

Ф. ЗАЙЦА�ў.

ПАГОНЯ ЗА МАРАЙ

Многія акцёры захапляюцца спортам. Многія спартсмены любяць тэатр. Але, напэўна, рэдка ў каго дзве гэтыя разнародныя стыхіі ўжываюцца так гарманіча, як у аднаго з лепшых танцоўшчыкаў Вялікага тэатра — Марыса Ліепы.

Усё пачалося з таго, што ў доме Ліепы весела сустракалі новы, 1945 год. Сярод гасцей быў дырэктар Рыжскай харэаграфічнай студыі. Убачыўшы Марыса, ён неяк адразу ўгадаў у ім будучага танцоўшчыка і тут жа прапанаваў бацькам аддаць хлопчыка вучыцца балетнаму мастацтву.

Марысу тады ішоў дзевяты год. Быў ён малы ростам, худы, бледны. Але характар меў заўзяты і бойкі. Захапляўся, зразумела, футболам, яшчэ гарадкамі і многім-многім іншым, але не танцамі. У студыі Марыс быў амаль ці не самым лянівым і непаспяваючым вучнем.

І зноў, як гэта часта бывае, умяшаўся выпадак. У 1950 годзе Марыс прыехаў у Маскву на першы агляд харэаграфічных вучылішчаў. Тут ён танцаваў па-дэ-труа з балета Чайкоўскага «Шчаўкунчык» і мазурку. Нечакана мазурка прайшла ў аглядзе з сапраўднай бліскучасцю. Але не пахвалы і апладысменты запалілі артыстычны агонь у душы Марыса. У Вялікім тэатры ён убачыў сапраўдныя ўзоры харэаграфічнага мастацтва, і яго ўразлівай душы адкрыўся цудоўны, вабячы, невядомы датуль свет...

Вярнуўшыся дамоў, у Рыгу, Ліепа каліграфічным почыркам вывеў у сваім дзённіку: «Я буду танцаваць «Лебядзінае возера»!

Пачалася захапляючая пагоня за марай.

Да позняга вечара прападаў ціпер Марыс у рэпетыцыйных залах, на спектаклях, канцэртах. Разумеючы недастатковасць сваёй фізічнай падрыхтоўкі, ён пачаў займацца спортам.

Марыс раптам вылавіў у сабе здзіўляючыя даныя плыўца. Поспехі ўпалі, як снег на галаву. За тры гады ён стаў чэмпіёнам Латвійскай ССР у плаванні вольным стылем. Яму пачалі прадказваць бліскучае спартыўнае будучае. Але Марыс павінен танцаваць «Лебядзінае возера»! І ён без ваганняў ставіць кропку на сваёй кар'еры спартсмена.

У 1953 годзе, пасля заканчэння вучылішча, маладога танцоўшчыка прынялі ў Тэатр оперы і балета. Яго поспех рос ад спектакля да спектакля. Але аднойчы Ліепа паклаў на стол дырэктара заяву аб уходзе і не куды-небудзь, не ў іншы тэатр, а... зноў у харэаграфічнае вучылішча, на гэты раз, праўда, масноўскае.

У родную Рыгу малады танцоўшчык вярнуўся, выдатна валодаючы ўсім багатым арсеналам класічнай тэхнікі. Ён хутка стаў вядучым танцоўшчыкам рэспубліканскага тэатра. Маладога артыста запрасілі на гастролі ў Будапешт, дзе ён разам з Маяй Плісецкай танцаваў у «Бахчысарайскім фантане», канцэртнай праграме і... «Лебядзіным возеры».

І нарэшце — Вялікі тэатр. Ліепа прыйшоў сюды не нясмелым вучнем, а майстрам са сваім разуменнем мастацтва, са сваёй, толькі яму ўласцівай манерай танца. Са спрытэрскай хуткасцю асвойваў ён рэпертуар лепшага балетнага тэатра краіны, у кожную партыю ўносячы часцінку свайго, непаўторнага, «ліепаўскага».

Ліепа не быў асілкам, але прадуманымі, сістэматычнымі заняткамі спортам дабіўся таго, што ціпер ён — адзін з лепшых «кавалераў» Вялікага тэатра, віртуозны майстар падтрымкі — моцны, спрытны, упэўнены. З ім ахвотна выступае выдатная савецкая балерына Вольга Лепяшынская. Іх дуэты ў спектаклях «Дон-Кіхот» і «Сцежкаю грому» ўражваюць сваёй вытанчанай прыгажосцю, пластычнай свабодай і натуральнай выразнасцю.

Кожны яго спектакль прыносіць з сабой штосьці новае, нечаканае, з кожным разам знікаюць недахопы і недаробкі, вобраз становіцца больш рэльефным, ёмістым, паўнакроўным.

Святлана ІВАНОВА,
Андрэй ДЗЬЯКАНАЎ.
(АДН).

ЗНЯВАГА ПІЛЬНАСЦЮ

(Заканчэнне. Пачатак на 2-й стар.).

І вось некалькі гадзін мы праседзелі «за круглым сталом» у кватэры Літвіна. Я чытаю, праглядаю цудам уцалелыя за даўнасцю гадоў пажоўклыя дакументы, вытрымкі з загадаў, фатаграфіі. І сярод усіх гэтых старых дакументаў некалькі разоў бяру ў рукі адзін свежы, зусім маленькі «дакуменцік», своеасаблівы кішанёвы каляндар са шматлікімі паметкамі. Гэта сведка. Сведка таго, колькі разоў пажылы чалавек з хворым сэрцам падымаўся на другі паверх і стукаўся ў дзверы раённага аддзела сацыяльнага забеспячэння. Трэба сказаць, што пасля перанесенай хваробы — інфаркта міякарда, Пётр Іванавіч пакінуў працу на трактарным заводзе і пачаў афармляць пенсію. Спачатку яму аформілі пенсію, як і належала, з улікам спецыфікі працы «ў гарачых цэхах», ільготную, у суме 100 рублёў (у новых грошах). Потым у рэвізора гарсабеса ўзнікла сумненне, некаторыя дакументы не зусім падыходзілі пад патрэбную катэгорыю. Літвіну ў пенсіі адмовілі. Ён пачаў атрымліваць толькі пенсію па хваробе, крыху больш, чым трыццаць рублёў. Пачалося новае афармленне дакументаў, пачаліся бясконцыя «блуканні па пакутах».

Вось толькі кавалачак таго, аб чым сведчыць маленькі кішанёвы каляндар. Паметка 12 студзеня. У гэты дзень яму сказалі: зайдзіце праз некалькі дзён. 17 студзеня — зайдзіце праз тыдзень. 25 студзеня—зайдзіце праз дзень. 27 студзеня — зноў праз тыдзень... І так аж па 25 сакавіка, па той дзень, калі на пасяджэнні камісіі Літвіну зноў аб'явілі: «Вам у пенсіі адмоўлена».

Цяжка недасведчанаму чалавеку разбірацца ў спецыяльных законах. Можна заблытацца і ў параграфах, і ў дадатках да іх, і ў шматлікіх тлумачэннях і агаворках. І я не буду браць на сябе такую смеласць сцвярджаць напэўна, што Пятру Іванавічу Літвіну, згодна тых дакументаў, якія ёсць, належыць ільготная пенсія. Падкрэсліваю — згодна дакументаў. Бо ў глыбіні душы поўнасцю пераканана, што за сваю працу ён такую пенсію заслугоўвае, і спадзяюся, што вельмі хутка буду пераканана не я адна. Хачу павесці размову пра іншае, пра сам прынцып вядзення гэтай справы. А можа і не толькі гэтай...

Пётр Іванавіч Літвін — чалавек заслужаны і вельмі паважаны. Яго ведаюць і ў Мінску на трактарным заводзе, памятаюць яшчэ і ў Харкаве, дзе пачынаўся яго працоўны шлях. Адным словам, сам чалавек ні ў чым не выклікае падазрэння, дакору, яму вераць, яму спачуваюць усе, каму даводзілася весці яго справу аб пенсіі. Чалавек не выклікае недавер'я. Ставяцца пад сумненне толькі яго дакументы. Прычым робіцца гэта з такой пакутлівай метадычнасцю, што нават не толькі хворае сэрца можа не вытрымаць... Дзесьці, ля адной з лічбаў, намечаных у календары Літвіна, сумненне выклікаў які-небудзь адзін перыяд яго працы, уявім сабе, што на Харкаўскім трактарным заводзе. Пётр Іванавіч едзе ў Харкаў, раздабывае патрэбныя «пацвярджанні сведак» (прашу прабачэння, але гэта афіцыйны тэрмін) у тым, што ён на самай справе працаваў з такога года па такі на такой вось пасадзе. «Цяпер усё?» — пытаецца ў райсабесе. «Здаецца, усё. Аддаём на подпіс рэвізору гарсабеса...»

А праз некалькі дзён аказваецца, што сумненне выклікае ўжо новы перыяд. Потым яшчэ адзін. Потым яшчэ і яшчэ, і так бясконца. То да пенсіі на ільготных умовах не хапала ўсяго толькі шэсць месяцаў і некалькі дзён, то раптам яму аб'яўляюць, што цяпер ужо трэба дакументальна нанава пацвердзіць яшчэ... тры гады.

Каб стала зразумела, як гэта адбываецца на справе, прыведу толькі адзін прыклад. У ім ёсць штосьці характэрнае, тым больш, што высветліць і ўдакладніць гэты «перыяд» (зноў такі карыстаюся афіцыйнай тэрміналогіяй), зусім не так складана. Дзея, як кажуць, адбывалася не ў Чалябінску ці на Алтаі, а... у Мінску.

Літвін па загаду быў пераведзен памочнікам начальніка сталеліцейнага цэха Мінскага трактарнага завода па абсталяванню. Сама па сабе гэтая пасада не ўваходзіць у пералік тых, якія належаць да прафесіі ільготнага тыпу (у дачыненні да пенсіі), але на самой справе Літвін у той час выконваў пасаду намесніка начальніка сталеліцейнага цэха, атрымліваў адпаведны аклад і г. д. Узнікла непаразуменне. Яго прыйшлося ўдакладніць. З трактарнага завода прыслалі дакументы, якія не пакідаюць ні кроплі сумнення, што Літвін на самой справе займаў тую пасаду, якая ўваходзіць у пераліковы спіс для ільготных пенсій, быў сапраўды намеснікам начальніка цэха. Дакументы пераканаўчыя, афармлены так, як належыць. Але рэвізор гарсабеса Баравік у сваім апошнім падліку гадоў, месяцаў і дзён, якія ўключаюцца ў пенсійны стаж Літвіна, гэты перыяд усё роўна не залічыла. Юрыст Міністэрства сацыяльнага забеспячэння тав. Мальцава яшчэ так-сяк згодна была б улічыць гэты час, але недзе ў аналах дадаткаў і дапаўненняў да законаў аб пенсіях ёсць агаворка, што змяненні ў працоўнай кніжцы павінны рабіцца нейкім іншым чынам, а не так, як гэта было зроблена ў Літвіна. І зноў пачынаецца блуканне, зноў павялічваецца колькасць характэрных чорненькіх паметак у календары.

Закон ёсць закон... Гэтыя словы я пачула не адзін раз. калі мы ўсе разам сабраліся ў Міністэрстве сацыяльнага забеспячэння: Клачко — работнік райсабеса Савецкага раёна, Баравік — інспектар гарсабеса, Мальцава — юрыст Міністэрства сацыяльнага забеспячэння. Тры чалавекі, якія маюць да гэтай справы непасрэднае дачыненне, тры афіцыйныя асобы. Кожная на сваім месцы выконвала свой абавязак і ні адна з іх не хацела зрабіць што-небудзь кепскае Літвіну асабіста. Вось Алена Віктараўна Клачко. Яна ўзрушана нашай размовай больш за ўсіх, бо шчыра, ад усёй душы спачувае Пятру Іванавічу. Ёй, безумоўна, вельмі крыўдна было б пачуць у свой адрас стандартныя абвінавачванні ў нячуласці, у фармалізме. Не трэба хвалявацца, Алена Віктараўна. Я не буду выказваць менавіта ў ваш адрас гэтыя абвінавачванні. Не буду рабіць гэтага і ў дачыненні да вельмі сімпатычнага юрыста міністэрства Мальцавай. І нават у дачыненні да рэвізора гарсабеса Баравік, хоць ясна адчуваю, што гэта ён сваім «звышпільным» рэвізорскім вокам ставіць і ставіць перад Літвіным адзін пытальнік за другім. Урэшце, яна таксама толькі выконвае свой службовы абавязак і таксама, калі паверыць на слова, вельмі спачувае Літвіну.

Хачу ў трэці раз звярнуцца да слоў «закон ёсць закон». Іх, гэтыя словы, вымаўляюць вельмі часта з самымі рознымі адценнямі. На гэты раз адценне было адно: што, маўляў, зробіш, супраць закону не пойдзеш... І вельмі ж хацелася сказаць у гэты момант тром супрацоўніцам сацыяльнага забеспячэння: таварышы, дарагія, а хто і калі вам унушыў такую думку, што наш савецкі закон меў на мэце абавязкова пакрыўдзіць, упячаміць інтарэсы Літвіна? Можа вы самі сваёй незвычайнай пільнасцю ўскладнілі ўсю гэтую справу, «на законных падставах» самі заблыталі яе. Хочаце, я праілюструю гэтую думку на канкрэтным, вядомым вам прыкладзе.

Не паверыўшы старым дакументам-арыгіналам Літвіна, выдадзеным у 30-х гадах, не паверыўшы яму асабіста, вы даслалі запытанне на Чалябінскі трактарны завод. А даведцы адтуль вы адразу ж лёгка і ахвотна паверылі, хоць іменна яе можна было паставіць пад сумненне перш за ўсё таму, што людзі, якія выдавалі яе, не працавалі з Літвіным, не памятаюць і не ведаюць яго. Але... «закон ёсць закон», ці ж не так? І вось вы ўжо лёгкай рукою скасавалі ўвесь чалябінскі перыяд працы Літвіна, і такім чынам, да ільготнай пенсіі яму зноў не хапае шасці месяцаў. Вось так і атрымліваецца гэтая бясконцая чарада, у якой — вы гэта адчуваеце і самі — ёсць знявага чалавечай годнасці. Знявага пільнасцю.

Так, іменна пільнасцю, гэтай вельмі добрай і карыснай якасцю, якая больш, чым усе іншыя, патрабуе ад людзей самага строгага захавання пачуцця меры. Перабольшыш хоць крышачку, і вось ужо, як чорт з пекла, выглядае той самы даўно забыты, даўно выкінуты намі, ненавісны, чужы «стыль», калі чалавек не хацеў верыць і баяўся верыць чалавеку.

ІХ НОРАВЫ, ІХ МАРАЛЬ

Факты з зарубежных газет і часопісаў

ПІСТАЛЕТ СТРАЛЯЕ... ФАРБАМІ

У Парыжы адкрылася мастацкая выстаўка «Кампарасьён 1962». На выстаўцы прадстаўлены самыя разнастайныя работы навейшых мастакоў. Французская мастачка Нікі дэ Сантфаль дэманструе свае карціны, намаляваныя з дапамогай пісталета, які страляе фарбай. Шведскі мастак Спаэры прадставіў работы, якія складаюцца з драўляных дошак з наклеенымі на іх рознымі прадметамі: старым чаравікам, попельніцай, талеркай, штанамі, запалкавымі каробкамі, бутэлькамі. Некаторыя работы ўяўляюць сабой старую дошку для афіш, з якой садраны палоскі, што адкрываюць споднія пласты афіш. Асаблівую ўвагу прыцягваюць «жывыя» карціны: залатая рыбка ў размаляваным акварыуме, папугаі ў клетках, мыш, якая прыводзіць у рух кола, і іншыя. Ёсць карціны, намаляваныя пляўкамі, ёсць «пустотныя карціны»: пустая рама, у якой кожны можа ўявіць сабе карціну па жаданню.

«Морген».

ЯК ЧЭХАЎ СТАЎ КАМУНІСТАМ

«З абурэннем я даведаўся, што тэатр універсітэта Міамі рыхтуе да пастаноўкі «Вішнёвы сад», гэтую рускую прапагандысцкую п'есу. Адразу відаць, якая абстаноўка пануе ў гэтым універсітэце нашага штата. Усім вядома, што Антон Чэхаў — гэта адзін з тых людзей, чые тэорыі прывялі да стварэння камунізма, які цяпер пануе ў Расіі. Дастаткова прачытаць яго п'есу, каб убачыць, што яна прасякнута рэвалюцыйнымі і сацыялістычнымі ідэямі, накіраванымі супраць Амерыкі».

З пісьма чытача, апублікаванага ў газеце «Міамінь юс».

МІСТЭР БУШЭ АДДАЕ ПЕРАВАГУ...

Містэр Жан Бушэ пачаў падрыхтоўку да сусветнай выстаўкі, якая адкрыецца ў Нью-Йорку ў 1964 годзе. На тэрыторыі будучай выстаўкі містэр Бушэ ўзводзіць будынак, у якім будзе змяшчацца шыкарны рэстаран «Францыя», і кабарэ «Казанова», дзе будуць выступаць 40 танцоўшчык стрыптыза (актрыс, якія распранаюцца ў час выканання танца.— **Рэд**). Як заявіў містэр Бушэ карэспандэнтам лепшымі танцоўшчыцамі стрыптыза з'яўляюцца француженкі і немкі. Для набору трупы містэр Бушэ выехаў у Еўропу. Ён наведае Францыю і Заходнюю Германію, а таксама Бельгію і Італію.

«Юманітэ».

БІБЛІЯ І БІЗНЕС

Недалёка ад Сан-Францыска, на плошчы ў 23 квадратныя кіламетры будуецца біблейскі горад. Тут з вялікай дакладнасцю ўзнаўляюцца гарады і сёлы, якія ўпамінаюцца ў бібліі: Назарэт, Іярдан і іншыя. Арганізатары будаўніцтва спадзяюцца, што натоўпы веруючых з усіх краін хлынуць сюды, каб агледзець гістарычныя месцы, і плата за ўваход акупіць выдаткі на будаўніцтва. Акрамя таго, будуць заключацца дагаворы з кінакампаніямі, якія здымаюць гістарычныя фільмы.

«Морген».

І ВАЎКІ СЫТЫЯ, І АВЕЧКІ ЦЭЛЫЯ

Вярхоўны суд Вялікабрытаніі даў растлумачэнне адносна дзеяння закону 1959 года аб забароне вулічнай прастытуцыі. У законе прадугледжана пакаранне для пасрэднікаў, якія вярбуюць кліентаў. Вярхоўны суд растлумачыў, што пакаранню падлягаюць толькі ўладальнікі ўстаноў, у вітрынах якіх выступаюць самі прастытуткі, што вярбуюць кліентаў. Змяшчэнне ж у вітрынах аб'яў і рэкламных плакатаў не з'яўляецца парушэннем закона.

«Фольксштымме».

ШЭЙХ ПАПАЎНЯЕ ГАРЭМ

Некалькі тыдняў назад ва ўсіх буйнейшых газетах Еўропы і Амерыкі была змешчана аб'ява арабскага шэйха Сулеймана эль Хурэйля, які паведамляў, што яму патрэбна прыгожая еўрапейка, не старэй 22 гадоў у якасці 42-й жонкі яго гарэма. Як паведамляе бонская «Камісія па ахове правоў моладзі», сярод велізарнай колькасці прапаноў, якія паступілі шэйху, большая частка з Заходняй Германіі.

«Вохенпост».

«БЫЦЦАМ МАЛПАЧКУ З ГАНКОНГА»

«Наша краіна (Заходняя Германія. — **Рэд.**) з'яўляецца буйнейшым экспарцёрам дзяцей у заходнім свеце. Дзесяткі тысяч дзяцей прадаюцца за граніцу пад выглядам усынаўлення ці ўдачарэння. Спецыяльныя пасрэднікі скупляюць дзяцей у шматдзетных бедных бацькоў або маці-адзіночак. Ілюстраваны каталог такіх дзяцей памагае багатым бяздзетным сем'ям выбраць дзіця на густу. Большая частка дзяцей ідзе ў ЗША. Сярод багатых амерыканцаў лічыцца добрым тонам прывозіць з Германіі ў якасці сувеніра нямецкае дзіця, падобна таму, як з Гонконга прынята прывозіць маленькую шаўковую малпачку».

«Міттаг».

МІСТЭР ДАРВАС РОБІЦЬ ДОЛАРЫ

Містэр Ніколас Дарвас, былы акрабат, напісаў і выдаў кнігу «Як я зарабіў на біржы два мільёны долараў». 150 тысяч экземпляраў гэтай кнігі па цане 4 долары 95 цэнтаў былі ў момант прададзены. Некаторыя чытачы, уведзеныя ў зман парадамі аўтара кнігі, панеслі буйныя страты і ўзбудзілі судовую справу супраць Дарваса. Генеральны пракурор Нью-Йорка, які вядзе расследаванне, заявіў, што ўсё напісанае ў гэтай кнізе з'яўляецца выдумкай, аднак паводле існуючых законаў аўтара нельга прыцягнуць да судовай адказнасці.

«Морген».

Галоўны рэдактар Н. Е. ПАШКЕВІЧ.

Рэдакцыйная калегія: З. І. АЗГУР, А. І. БУТАКОЎ, К. Л. ГУБАРЭВІЧ, В. Ул. ІВАШЫН, А. Н. МАРЦІНОВІЧ (адказны сакратар), П. Ф. ПРЫХОДЗЬКА, Р. К. САБАЛЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), М. Г. ТКАЧОЎ, І. З. ШАРАХОЎСКІ, І. Б. ШАЦІЛА, Г. Р. ШЫРМА.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР. Минск.

Адрас рэдакцыі: г. Мінск, вул. Захарава, 19. Тэлефоны: прыёмная рэдакцыі—3-24-61, намесніка галоўнага рэдактара—3-25-25, адказнага сакратара—3-25-25, аддзела літаратуры—3-22-04, аддзела мастацтва — 3-24-62, аддзела культуры—3-22-04, выдавецтва—3-19-52, бухгалтэрыі—3-11-03

«Літаратура і мастацтва» выходзіць два разы на тыдзень: у аўторак і пятніцу

АТ 01309

Друкарня выдавецтва «Звязда».